

# I квартал 2026 года

## СТУДЗЕНЬ

**1 Новы год**

**1 Бандарэнка Валерый** (1946, Расія – 2021), акцёр, заслужаны артыст Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння

**1 Белавусаў Уладзімір** (1921, в. Слабодка, Шуміл. р-н – 2006), мастак кіно, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння

**1 Віцебскі алейнаэкстракцыйны завод**, ААТ (1931) – 95 гадоў з пачатку дзейнасці

**1 Жлобінская швейная фабрыка,** ААТ у складзе канцэрна "Беллёгпрам" (1961) – 65 гадоў з часу заснавання

**1 Калодзішчыметэаралагічная станцыя** (Мін. р-н, 1981) – 45 гадоў з пачатку дзейнасці

**1 Карскі Яўхім** (1861, в. Лаша, Гродзен. пав., Гродзен. губ. (цяпер Гродзен. р-н) – 1931), філолаг-славіст, заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фалькларыст, палеограф, педагог, акадэмік Пецярбургскай АН, правадзейны член Інбелкульта, Чэшскай АН – 165 гадоў з дня нараджэння

**1 Кудравец Анатоль** (1936, в. Аколіца, Кліч. р-н – 2014), пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, кавалер ордэна Дружбы народаў – 90 гадоў з дня нараджэння

**1 Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь** (Мінск, 1956) – 70 гадоў з часу правядзення першай тэлеперадачы

**1 Раўбель Мікалай** (1956, в. Рафалін, Асіпов. р-н), лесавод, дырэктар дзяржаўнай вопытнай лесагаспадарчай установы "Асіповіцкі вопытны лясгас", заслужаны лесавод Беларусі, ганаровы лесавод, ганаровы грамадзянін Асіповіцкага раёна, кавалер ордэна Пашаны – 70 гадоў з дня нараджэння

**1 Філіял "Барымак" УП "Барысаўскі камбінат хлебапрадуктаў", ААТ "Мінскаблхлебапрадукт"**, адзін з буйнейшых вытворцаў макаронных вырабаў у Рэспубліцы Беларусь (1931) – 95 гадоў з часу выпуску першай прадукцыі

**1 Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі,** дзяржаўная навуковая ўстанова, мэта якой – навуковае забеспячэнне эканамічнага, сацыяльнага, дзяржаўна-прававога і культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь, рацыянальнага выкарыстання і аховы прыроды (Мінск, 1971) – 55 гадоў з часу стварэння на базе сектара замежнай гістарыяграфіі Беларусі Інстытута гісторыі АН БССР

**2 Зарэмба Міхась (Міхаіл)** (1941, в. Знаменка, Лагойскі р-н – 2002), пісьменнік, перакладчык, аўтар кніг аповесцей і апавяданняў для дзяцей, перакладаў твораў рускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў, рамана Г. Уэлса "Чалавек-невідзімка" – 85 гадоў з дня нараджэння

**3 Башылаў Міхаіл** (1821, Жлоб. р-н – 1870), мастак, ілюстратар – 205 гадоў з дня нараджэння

**3 Губарэвіч Віталь** (1926, г. п. Наваельня, Дзятл. р-н – 1976), паэт, грамадскі дзеяч – 100 гадоў з дня нараджэння

**3 Кандрусевіч Тадэвуш** (1946, в. Адэльск, Гродзен. р-н), дзеяч Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі, арцыбіскуп, мітрапаліт Мінска-Магілёўскі да 3 студзеня 2021 года – 80 гадоў з дня нараджэння

**3 Харык Рыгор** (1951, г. Мінск), артыст аперэты, заслужаны артыст Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння

**3 Гібсан Мэл** (1956), амерыканскі і аўстралійскі акцёр, рэжысёр, сцэнарыст і прадзюсар – 70 гадоў з дня нараджэння

**4 Дзень Ньютана**

**Тэматычная паліца:**

- Сусветны сімвал навукі

*Геній ёсць цярпенне думкі, засяроджанай у вядомым накірунку.*

Ісак Ньютан

**5 Дзень работнікаў сацыяльнай абароны**

**5 "Гомельскія ведамасці"**, грамадска-палітычная газета, штотыднёвік Гомельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў (1991) – 35 гадоў з пачатку выдання

**5 Піліповіч Уладзімір** (1931, в. Слабада, Ма-

зыр. р-н – 2018), вучоны-фізік, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўный прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння

**5 Сідарава Валянціна** (1956, г. Мінск), мастачка, якая працуе ў галіне станковай і кніжнай графікі, мастацкай фатаграфіі, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння

**6 Герасіменка Павел** (1976, г. Маладзечна), скульптар, аўтар твораў у мемарыяльнай, манументальнай і станковай скульптуры – 50 гадоў з дня нараджэння

**6 Шабалін Анатоль** (1946, г. Мінск), архітэктар, які працаваў над праектамі будынкаў Мінскэнерга, Палаца Рэспублікі, культурна-спартыўнага комплекса "Мінск-Арэна", рэстаўрацыяй і рэканструкцыяй Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння

**6 Яцына Пётр** (1906, г. Магілёў – 1964), беларускі і расійскі скульптар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, удзельнік Вялікай Айчынай вайны – 120 гадоў з дня нараджэння

**6 Барэт Сід** (1946-2006), англійскі музыкант, паэт і мастак, заснавальнік групы "Pink Floyd" – 80 гадоў з дня нараджэння

**7 Нараджэнне Хрыстова ў праваслаўных**

**7 "Гродненские епархиальные ведомости"**, газета, афіцыйны орган Гродзенскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы (1901) – 125 гадоў з пачатку выдання

**7 Раеўскі Іосіф** (1901, Расія – 1972), расійскі і беларускі рэжысёр тэатра, педагог, акцёр, заслужаны артыст Расіі, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, народны артыст Беларусі і СССР – 125 гадоў з дня нараджэння

**7 Шыльдэр Карл (Аляксандр)** (1786, маёнтак Сіманава, Невельскі пав., Віцеб. губ. (цяпер Расія) – 1854), расійскі ваенны інжынер, генерал-інжынер, генерал-ад'ютант, удзельнік Бабруйскай абароны 1812 г., вынаходнік і рацыяналізатар у галіне ваеннай тэхнікі, стваральнік першай у свеце броніраванай падводнай лодкі-ракетаносца – 240 гадоў з дня нараджэння

**8 Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі** (1921) – 105 гадоў з часу стварэння на I з'ездзе Саюза работнікаў асветы і сацыялістычнай культуры

**8 Каханоўскі Генадзь** (1936, в. Дамашы, Маладзеч. р-н – 1994), вучоны-гісторык, археолаг, краязнаўца, фалькларыст, літаратуразнаўца, аўтар шэрагу літаратурна-краязнаўчых нарысаў, кніг па гісторыі гарадоў Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння

**8 Лур'е Саламон** (1891, г. Магілёў – 1964), гісторык антычнасці, літаратар, філолаг – 135 гадоў з дня нараджэння

**10 Дзень адкрыцця першай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН** (1946) – 80 гадоў таму

**10 Лаўроў Георгій** (1896, Расія – 1967), расійскі і беларускі архітэктар, сярод работ якога – галоўны корпус і карпусы шэрагу факультэтаў БДУ, будынкі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна, Беларускага політэхнічнага інстытута, друкарні імя Ф. Скарыны АН БССР і іншае – 130 гадоў з дня нараджэння

**10 Вільсан Роберт** (1936), амерыканскі фізік, Нобелеўскі лаўрэат – 90 гадоў з дня нараджэння

**11 Міжнародны дзень "дзякуй"**

Кніжная выстава:
*Дзякуй! Дзякуй! Вялікі дзякуй!*

**11 Борх Міхал** (1806-1881), літаратуразнаўца, перакладчык, бібліяфіл, аўтар кніг па гісторыі Падзвіння, гісторыка-літаратурнай працы пра Еўфрасінню Полацкую, аповесці "Рагнеда" і іншых – 220 гадоў з дня нараджэння

**11 Жывалеўскі Валерый** (1961, г. Гродна), гітарыст, педагог, адзін з пачынальнікаў беларускай гітарнай школы – 65 гадоў з дня нараджэння

**11 Сідараў Аляксандр** (1951, г. Віцебск), мастак тэатра лялек, лаўрэат тэатральнай прэміі імя Л. Мазалеўскай, першы лаўрэат прэміі імя І. Ушакова – 75 гадоў з дня нараджэння

**12 Андросаў Міхаіл** (1906, Расія – 1951), архітэктар, аўтар праекта планіроўкі Лепеля, суаўтар генпланаў аднаўлення і развіцця Мінска і Магілёва – 120 гадоў з дня нараджэння

**12 Масленікаў Уладзімір** (1956, г. Мінск), мастак у галіне станковага жывапісу ў жанрах пейзажа, партрэта, нацюрморта, уладальнік ганаровага знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" – 70 гадоў з дня нараджэння

**12 Лондан Джэк** (1876-1916), амерыканскі пісьменнік, аўтар прыгодніцкіх твораў – 150 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- Джек Лондон: характер и творчество

**12 Паўлс Райманд** (1936), латвійскі кампазітар, піяніст, дырыжор, палітычны дзеяч – 90 гадоў з дня нараджэння

**12 Мулявін Уладзімір** (1941, Расія – 2003), артыст эстрады, кампазітар, аранжыроўшчык, стваральнік і мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры", народны артыст Беларусі і СССР, заслужаны дзеяч культуры Польшчы, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, кавалер ордэна Ф. Скарыны – 85 гадоў з дня нараджэння

Тэматычныя паліцы:
- Лёс музычнага генія
- Вклад "Песняров" в белорусскую культуру

**14 Чарняўскі Уладзіслаў** (1916, былы засценак Амружын (цяпер Ашмян. р-н) – 2001), святар, дзеяч Рымска-Каталіцкага Касцёлу, удзельнік беларускага хрысціянскага руху XX ст., перакладчык Бібліі і Катэхізіса на беларускую мову – 110 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- Святар і патрыёт Уладзіслаў Чарняўскі

*І пайшоў ён ад нас нібы слова жывое,*
*І прайшоў ён праз нас, як святло з абразоў,*
*Каб мілей нам зрабілася наша, святое,*
*Каб мы ўспомнілі шлях да забытых крыжоў.*

Віктар Шніп



**14 У Рыме знойдзена мармуровая скульптурная група "Лаакаон і яго сыны"** (1506) – 520 гадоў таму

**15 Калінковіч (сапр. Калянковіч) Мікалай** (1951, в. Цна, Лунін. р-н – 1990), пісьменнік, літаратуразнаўца, крытык, публіцыст, даследчык беларуска-рускіх, беларуска-туркменскіх літаратурных сувязяў, уладальнік шэрагу ўрадавых узнагарод – 75 гадоў з дня нараджэння

**15 Кудлачоў Віктар** (1936, в. Сласцёны, Дрыбін. р-н), паэт, лаўрэат прэміі імя А.І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама "За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва", дыпламант рэспубліканскага літаратурнага конкурсу Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч Беларускага таварыства інвалідаў па зроку – 90 гадоў з дня нараджэння

**15 Танковіч Георгій** (1946, в. Ерашова, Шуміл. р-н), мастак-акварэліст – 80 гадоў з дня нараджэння

**15 Шуба Павел** (1926, в. Танежыцы, Слуцкі р-н – 2000), мовазнаўца, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны – 100 гадоў з дня нараджэння

**15 Дзень нараджэння Вікіпедыі**

**15 Мандэльштам Восіп** (1891-1938), расійскі паэт, празаік, перакладчык, літаратурны крытык – 135 гадоў з дня нараджэння

**16 Сусветны дзень "TheBeatles"**

**16 Аскназій Ісак** (1856, г. Верхнядзвінск – 1903), жывапісец, аўтар жанравых твораў на тэмы жыцця гарадоў і мястэчак Беларусі, карцін на біблейскія сюжэты, акадэмік Імператарскай Акадэміі мастацтваў (Санкт-Пецярбург) – 170 гадоў з дня нараджэння

**16 Вілейска-Мінская водная сістэма**, сістэма вадасховішчаў, каналаў, гідратэхнічных збудаванняў, прыродных вадаёмаў і вадацёкаў (Вілейскі, Маладзеч. і Мін. р-ны; 1976) – 50 гадоў з часу ўводу ў эксплуатацыю

**16 Трафімчук Алег** (1941, г. Мінск – 1984), архітэктар, аўтар манумента ў гонар савецкай маці-патрыёткі (Жодзіна), праектаў планіроўкі забудовы Маладзечна, Клецка, Мядзела, Вілейкі і іншых гарадоў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР – 85 гадоў з дня нараджэння

**17 Дзень дзіцячага вынаходніцтва**

Кніжная выстава:
*Пра вынаходніцтвы і вынаходнікаў-дзяцей*

**17 Мацкевіч Мікалай** (1941, в. Старое Сяло, Зэльв. р-н), рэжысёр, заснавальнік і першы мастацкі кіраўнік Мінскага абласнога драматычнага тэатра (г. Маладзечна), заслужаны работнік культуры Беларусі – 85 гадоў з дня нараджэння

**18 Кавальчук Валерый** (1961, Брэсцкі р-н), жывапісец, педагог – 65 гадоў з дня нараджэння

**18 Сёмуха Васіль** (1936, былы х. Ясенец, Пружан. р-н – 2019), перакладчык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа – 90 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- Лепшы еўрапейскі перакладчык "Фаўста" Гётэ

**19 Дзень выратавальніка**

Тэматычная паліца:
- Выратаванне жыцця – занятак цяжкі і пачэсны

**19 Паплаўская Наталля** (1931, Расія), мастачка, якая працуе ў галіне станковай і кніжнай графікі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння

Кніжна-ілюстрацыйныя выставы:
*Мастакі-ілюстратары Наталля і Георгій Паплаўскія*
*Бліскучая пара беларускага мастацтва*

**20 Піятроўскі Рыгор** (1881, Віцеб. вобл. ці Кракаў (Польшча) – 1935), адзін з першых авіятараў Расійскай імперыі, першы ваенна-марскі лётчык, дыпламат, кавалер ордэна Святога Савы (Сербія) – 145 гадоў з дня нараджэння

**20 Ральцэвіч Вікенцій** (1936, в. Гарбавічы, Чавускі р-н – 2020), мастак, які працаваў у акварэлі, станковай графіцы, у галіне эзатэрычнага мастацтва – 90 гадоў з дня нараджэння

**21 Міжнародны дзень абдымкаў**

**21 Дзень інжынерных войскаў**

**21 Туранкоў Аляксей** (1886, Расія – 1958), кампазітар, адзін з заснавальнікаў прафесійнай музычнай творчасці ў беларускай музыцы, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 140 гадоў з дня нараджэння

**21 Майсееў Ігар** (1906-2007), расійскі харэограф, балетмайстар, педагог, народны артыст СССР – 120 гадоў з дня нараджэння

**21 Бабаджанян Арно** (1921-1983), армянскі кампазітар, народны артыст СССР – 105 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Як нараджаюцца незабыўныя песні?*

*Зямля, хоць такая вялікая,*
*А ўсяго пясчынка сусвету;*
*А ў песні, самай кароткай,*
*Змяшчаецца цэлы сусвет.*

Янка Сіпакоў

– Кампазітар Арно Бабаджанян
– Паэт Роберт Раждзественскі
– Спявак Муслім Магамаеў

**21 Дамінга Пласіда** (1941), іспанскі оперны спявак (тэнар), дырыжор – 85 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- Зорка сусветнага опернага мастацтва

**22 Александровіч Андрэй** (1906, г. Мінск – 1963), паэт, адзін з арганізатараў літаратурнага аб'яднання "Маладняк", член-карэспандэнт НАН Беларусі – 120 гадоў з дня нараджэння

**22 Арлоў Ігар** (1956, г. Мінск), мастак, які працуе ў галіне станковага жывапісу – 70 гадоў з дня нараджэння

**22 Бэкан Фрэнсіс** (1561-1629), англійскі філасаф, гісторык, палітык – 465 гадоў з дня нараджэння

**23 Дзень ручнога пісьма (Дзень почырку)**

**23 Грыгаровіч Ігар** (1936, г. Мінск – 1986), жывапісец, які працаваў у станковым жывапісе ў жанрах партрэта і фігуратыўнай карціны – 90 гадоў з дня нараджэння

**23 Зінкевіч Уладзімір** (1951, в. Стралічава, Хойн. р-н), жывапісец, творы якога захоўваюцца ў вядучых музеях Беларусі, Расіі, установах Германіі, Бельгіі, Карэі, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ганаровы член Расійскай акадэміі мастацтваў, кавалер ордэна Ф. Скарыны, ганаровы грамадзянін Светлагорска – 75 гадоў з дня нараджэння

**23 Манферан Агюст** (1786-1858), французскі архітэктар, стваральнік Ісакіеўскага сабора ў Санкт-Пецярбургу – 240 гадоў з дня нараджэння

**24 Міжнародны дзень адукацыі**

**Кніжная выстава:**
*Вучэнне з задавальненнем*

**24 Міжнародны дзень эскімо**

**24 Алонцаў Аляксандр** (1941, г. Брэст – 2013), мастак, аўтар прац у станковай графіцы, акварэлі, педагог – 85 гадоў з дня нараджэння

**24 Мушынскі Міхась (Міхаіл)** (1931, в. Мокрае, Бых. р-н – 2018), літаратуразнаўца, тэкстолаг, крытык, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, прэміі НАН Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння

**24 Пазнякоў Міхась (Міхаіл)** (1951, в. Заброддзе, Бых. р-н), пісьменнік, многія вершы якога пакладзены на музыку, перакладчык, мовазнаўца, журналіст, член-карэспандэнт Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў – 75 гадоў з дня нараджэння

**24 Гофман Эрнст** (1776-1822), нямецкі пісьменнік, кампазітар – 250 гадоў з дня нараджэння

**24 Ром Міхаіл** (1901-1971), расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст, педагог, народны артыст СССР – 125 гадоў з дня нараджэння

**25 Дзень студэнтаў (Таццянін дзень)**

**25 Герашчанка Дзмітрый** (1951, г. Мінск), архітэктар, па праектах якога пабудаваны паркі і водаахоўныя зоны многіх беларускіх гарадоў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР – 75 гадоў з дня нараджэння

**25 Дабрынін Вячаслаў** (1946-2024), эстрадны спявак, кампазітар, народны артыст Расіі – 80 гадоў з дня нараджэння

**26 Міжнародны дзень мытніка**

**26 Марыта Акіа** (1921-1999), японскі прадпрымальнік і вынаходнік, заснавальнік кампаніі Sony – 105 гадоў з дня нараджэння

**27 Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту** (свята ААН)

**Кніжныя выставы:**
*Забываць нельга*
*Беларускія гета: месцы смутку і памяці*

**27 Кігн-Дзедлаў Уладзімір** (1856, Расія – 1908), расійскі пісьменнік, які амаль увесь час пражыў у Беларусі і пісаў пра Беларусь – 170 гадоў з дня нараджэння

**27 Няфёд Уладзімір** (1916, Расія – 1999), тэатразнаўца, педагог, драматург, аўтар акадэмічных прац і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі беларускага сцэнічнага мастацтва, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, тэатральнай прэміі імя К. Крапівы, кавалер ордэна "Знак Пашаны" – 110 гадоў з дня нараджэння

**27 Моцарт Вольфганг Амадэй** (1756-1791), аўстрыйскі кампазітар і музыкант – 270 гадоў з дня нараджэння

**12**
**Лондан Джэк**
(1876-1916), амерыканскі пісьменнік, аўтар прыгодніцкіх твораў – 150 гадоў з дня нараджэння



**15**
**Мандэльштам Восіп**
(1891-1938), расійскі паэт, празаік, перакладчык, літаратурны крытык – 135 гадоў з дня нараджэння



**27**
**Моцарт Вольфганг Амадэй**
(1756-1791), аўстрыйскі кампазітар і музыкант – 270 гадоў з дня нараджэння

**30**
**Шамякін Іван** (1921, в. Карма, Добруш. р-н – 2004), народны пісьменнік Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння



Кніжная выстава:
*Музычны геній Моцарта*

**27 Салтыкоў-Шчадрын Міхаіл** (1826-1889), расійскі пісьменнік-празаік, сатырык – 200 гадоў з дня нараджэння

**27 Куінджы Архіп** (1841-1910), расійскі мастак, майстар пейзажнага жывапісу – 185 гадоў з дня нараджэння

**28 Міжнародны дзень абароны персанальных дадзеных**

**28 Дашчынскі Юзаф** (1781, г. Вільня – 1844), піяніст, кампазітар, дырыжор, педагог – 245 гадоў з дня нараджэння

**28 Папоў Іван** (1966, г. Рэчыца), жывапісец, аўтар прац у станковым жывапісе – 60 гадоў з дня нараджэння

**28 Сапега Пётр Павел** (1701, Германія – 1771), дзяржаўны дзеяч ВКЛ – 325 гадоў з дня нараджэння

**28 Ключэўскі Васіль** (1841-1911), расійскі гісторык, акадэмік – 185 гадоў з дня нараджэння

**29 Дзень мабілізацыі супраць пагрозы ядзернай вайны**

**29 Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**, дзяржаўная вышэйшая навучальная ўстанова па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў органаў дзяржаўнага кіравання, кіруючых кадраў і спецыялістаў народнай гаспадаркі (г. Мінск, 1991) – 35 гадоў з часу заснавання

**29 Шэлег Вольга** (1931, Стаўб. р-н – 1965), мовазнаўца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР – 95 гадоў з дня нараджэння

**29 Ралан Рамэн** (1866-1944), французскі пісьменнік, Нобелеўскі лаўрэат – 160 гадоў з дня нараджэння

**30 Шамякін Іван** (1921, в. Карма, Добруш. р-н – 2004), народны пісьменнік Беларусі, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Літаратурнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Літаратурнай прэміі Міністэрства абароны СССР, Прэміі Саюзнай Дзяржавы Беларусі і Расіі, узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам “Знак Пашаны”, ордэнам Дружбы народаў, ордэнам Айчыны III ст., імем якога названа вуліца ў Мінску, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт – 105 гадоў з дня нараджэння

Кніжныя выставы:
*Голас нескаронага народа (ваенныя творы)*
*З кнігі – на экран (гісторыі экранізацый)*

**30 Уат Джэймс** (1736-1819), шатландскі вучоны, вынаходнік паравой машыны – 290 гадоў з дня нараджэння

**31 Міжнародны дзень ювеліра**

**31 Багданава (дзявочае Сачанка) Галіна** (1961, г. Крычаў), пісьменніца – 65 гадоў з дня нараджэння

**31 Купава Мікола (Мікалай)** (1946, г. Орша), жывапісец, графік, аўтар прац у станковай і кніжнай графіцы, экслібрысе ў тэхніцы лінарыту, акварэлі, літаграфіі, педагог – 80 гадоў з дня нараджэння

Кніжна-ілюстрацыйная выстава:
*Славутыя беларусы ў творах Міколы Купавы*

**31 Міцкевіч Міхаіл** (1926, г. Мінск – 2020), вучоны ў галіне тэхналогіі апрацоўкі матэрыялаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, спартсмен (стэндавая стральба), майстар спорту, сын Я. Коласа – 100 гадоў з дня нараджэння

**31 Ванга** (1911-1996), балгарская прадказальніца – 115 гадоў з дня нараджэння

## ЛЮТЫ

**1 Зянькевіч Рамуальд** (1811, Завілейскі пав., Вілен. губ.– 1868), этнограф, фалькларыст, археолаг, краязнаўца, педагог – 215 гадоў з дня нараджэння

**1 Мінскі абласны драматычны тэатр** (г. Маладзечна, 1991) – 35 гадоў з часу стварэння

**1 Нарачанская геафізічная абсерваторыя Цэнтра геафізічнага маніторынгу НАН Беларусі** (в. Целякі, Мядзел. р-н, 1981) – 45 гадоў з пачатку штодзённых назіранняў

**1 Пратасеня Іван** (1931, в. Знамя, Слуцкі р-н – 2022), мастак-акварэліст, графік, сярод работ якога пейзажы, тэматычныя карціны, партрэты – 95 гадоў з дня нараджэння

**1 Саломка Канстанцін** (1916, в. Узбалаць, Валож. р-н – 1990), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (разьба па дрэву) – 110 гадоў з дня нараджэння

**2 Беларуская асацыяцыя камунікатыўнай лінгвістыкі**, прафесійная лінгвістычная арганізацыя, створаная на базе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта (г. Мінск, 1991) – 35 гадоў з часу заснавання

**2 Сусветны дзень водна-балотных угоддзяў**

**2 Зільбер Леанід** (1941, г. Віцебск), беларускі і ізраільскі скульптар, які працуе ў галіне станковай і манументальнай пластыкі – 85 гадоў з дня нараджэння

**2 Скарга (Павенскі) Пётр** (1536, Польшча – 1612), царкоўны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, пачынальнік польскай аратарскай прозы, заснавальнік і першы рэктар Віленскай езуіцкай акадэміі (цяпер Вільнюскі ўніверсітэт) – 490 гадоў з дня нараджэння

**3 Мінская духоўная акадэмія імя свяціцеля Кірылы Тураўскага Беларускай Праваслаўнай Царквы (Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхата),** вышэйшая багаслоўская навучальная ўстанова Беларускай Праваслаўнай Царквы (г. Мінск,

раней в. Жыровічы, Слонім. р-н; 1996) – 30 гадоў з часу стварэння

**3 Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі,** рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання, які ў сваёй дзейнасці спалучаў функцыі спецслужбы і праваахоўнага органа (1941) – 85 гадоў з часу стварэння

**3 Сангушка Геранім** (1611, Арш. р-н – 1657), рэлігійны дзеяч ВКЛ – 415 гадоў з дня нараджэння

**4 Сусветны дзень барацьбы з ракавымі захворваннямі**

**4 Нацыянальная камісія Беларусі па радыяцыйнай ахове пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь,** міжгаліновы навукова-экспертны і рэкамендацыйна-кансультатыўны орган па пытаннях забеспячэння радыяцыйнай бяспекі, радыяцыйнай абароны і радыяцыйнага кантролю (г. Мінск, 1991) – 35 гадоў з часу стварэння

**4 Касцюшка Тадэвуш Андрэй Банавентура** (1746-1817), ваенны і палітычны дзеяч, нацыянальны герой Беларусі, Літвы, Польшчы, Злучаных Штатаў Амерыкі, ганаровы грамадзянін Францыі – 280 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Мужнасць, самаахвярнасць, высакароднасць*

**5 Алексютовіч Мікалай** (1921, Пухав. р-н – 1967), вучоны-філосаф, які адзін з першых даў навуковы аналіз светапогляду Скарыны і ўвёў у навуковы ўжытак творы беларускіх мысліцеляў XVI-XVIII стст. – 105 гадоў з дня нараджэння

**6 Міжнародны дзень бармэна**

**6 Стальмашонак Сяргей** (1956, Расія), мастак, які працуе ў кніжнай, часопіснай і станковай графіцы, экслібрысе – 70 гадоў з дня нараджэння

**7 Гаравая Галіна** (1941, Расія – 2011), скульптар, якая працавала ў манументальнай, станковай, мемарыяльнай і паркавай скульптуры. Яе творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Траццякоўскай галерэі, прыватных калекцыях Італіі, Францыі, Германіі, Аўстрыі – 85 гадоў з дня нараджэння

**7 Еўлашоўскі (Еўлашэўскі) Фёдар** (1546, г. Ляхавічы – 1619), грамадскі дзеяч, пісьменнік-мемуарыст – 480 гадоў з дня нараджэння

**7 Зямкевіч Рамуальд** (1881, Польшча – 1943), бібліёграф, этнограф, гісторык беларускай літаратуры – 145 гадоў з дня нараджэння

**7 Конанаў Уладзімір** (1956, Расія), скульптар, аўтар твораў у манументальнай і паркавай скульптуры – 70 гадоў з дня нараджэння

**7 Ляўданскі Уладзімір** (1911, в. Гудавічы, Чэрв. р-н – 1973), пісьменнік, перакладчык – 115 гадоў з дня нараджэння

**7 Міцкевіч (Каменская) Марыя** (1891, г. Ашмяны – 1945), настаўніца, жонка Я. Коласа, якая была першым чытачом, слухачом, крытыкам твораў свайго мужа – 135 гадоў з дня нараджэння

**7 Пола Вера** (1901, г. Мінск – 1989), актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР – 125 гадоў з дня нараджэння

**7 Макоўскі Уладзімір** (1846-1920), расійскі мастак, акадэмік – 180 гадоў з дня нараджэння

**7 Антонаў Алег** (1906-1984), расійскі авіяканструктар, акадэмік – 120 гадоў з дня нараджэння

**8 Малец Янусь (Іван)** (1951, Паст. р-н), паэт – 75 гадоў з дня нараджэння

**8 Мележ Іван** (1921, в. Глінішча, Хойн. р-н – 1976), пісьменнік, грамадскі дзеяч, народны пісьменнік Беларусі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я. Коласа, Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, кавалер ордэна "Знак Пашаны", удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, імя якога носяць вуліцы ў Мінску, Гродне, Лельчыцах, Хойніках – 105 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Паэтычны эпас "Палеская хроніка"*

**8 Доу Джордж** (1781-1829), англійскі мастак – 245 гадоў з дня нараджэння

**8 Бакст Леў** (1866-1924), расійскі мастак беларускага паходжання, сцэнограф, кніжны ілюстратар – 160 гадоў з дня нараджэння

**9 Міжнародны дзень стаматолага**

**9 Зарыцкі Эдуард** (1946, Расія – 2018), кампазітар, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны – 80 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- Эдуард Зарыцкі: з залатой калекцыі беларускай песні

*Таленавіты, высакародны, дасціпны.*
Васіль Жуковіч

**9 Мяснікоў (сапр. Мяснікян) Аляксандр** (1886, Расія – 1925), удзельнік Першай сусветнай вайны, рэвалюцыянер, партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з кіраўнікоў устанаўлення савецкай улады ў Беларусі, імя якога носіць плошча і вуліца ў Мінску – 140 гадоў з дня нараджэння

**9 Наваі Алішэр** (1441-1501), узбекскі паэт, мысліцель і дзяржаўны дзеяч – 585 гадоў з дня нараджэння

**10 Дзень нараджэння праса,** яго першае дакументальнае згадванне (1636) – 390 гадоў таму

**10 Знойдзены саркафагі ў Даліне цароў** (Егіпет, 2006) – 20 гадоў таму

Кніжная выстава:
*Культура Старажытнага Егіпта – гэта неверагодна цікава!*

**10 Дзівінская Валянціна** (1936, Украіна), ма-

стак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (шкло) – 90 гадоў з дня нараджэння

**10 Кухарэнка Мікалай** (1956, Расія), мастак, які працуе ў галіне станковага жывапісу ў жанрах партрэта, пейзажа, нацюрморта, мастацтвазнавец, педагог – 70 гадоў з дня нараджэння

**11 Міжнародны дзень жанчын і дзяўчынак у навуцы** (свята ААН)

**Кніжныя выставы:**
*Жанчыны, якія ўзбагацілі навуку*
*І ў навуцы бываюць прынцэсы!*

**11 Сусветны дзень хворага**

**11 Сарока Фёдар** (1956, в. Вялікае Сяло,Мінск. вобл. мастак, які працуе ў галіне рэстаўрацыі манументальнага і станковага тэмпернага жывапісу – 70 гадоў з дня нараджэння

**12 Дзень Дарвіна (Міжнародны дзень навукі і гуманізму)**

**12 Міжнародны дзень шлюбных агенцтваў**

**12 Вашкевіч Руслан** (1966, г. Мінск), графік, жывапісец, скульптар – 60 гадоў з дня нараджэння

**12 Дрынеўскі Міхаіл** (1941, в. Тонеж, Лельч. р-н – 2020), харавы дырыжор, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі "За духоўнае адраджэнне", прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, кавалер ордэна Францыска Скарыны – 85 гадоў з дня нараджэння

**Тэматычныя паліцы:**

- Падзвіжнік беларускай песні

*Няма больш пачэснай справы, як несці народу яго ж песенную, музычную і танцавальную спадчыну, радаваць людзей родным…*

Міхаіл Дрынеўскі

- Міхаіл Дрынеўскі: жыццё як песня

*Даў жа Бог чалавеку талент – іскрысты, мудры, шчодры!*

Зіновій Прыгодзіч

**12 Санько Яўген** (1931, Украіна – 1990), скульптар, педагог – 95 гадоў з дня нараджэння

**12 Паўлава Ганна** (1881-1931), расійская артыстка балета, адна з найвялікшых балерын XX ст.– 145 гадоў з дня нараджэння

**Кніжная выстава:**
*Гнна Паўлава – легенда балету*

**13 Сусветны дзень радыё**

**13 Корсак Юліян** (1806, г. Слонім – 1885), паэт, перакладчык, які пераклаў на польскую мову творы Д. Байрана, І. Гётэ, Ф. Шылера, Гарацыя – 220 гадоў з дня нараджэння

**14 Міжнародны дзень дарэння кніг**

**Кніжныя выставы:**
*Чытацкія падарункі бібліятэцы*
*Аўтографы нашых гасцей*
*Падарыце кнізе другое жыццё!*
*З хатняй бібліятэкі – у школьную*

**14 Дзень камп'ютаршчыка**

**14 Бусел Яўген** (1936, в. Міхайлаўка, Светлагор. р-н), мастак, які працуе ў галіне плаката, кніжнай і станковай графікі, акварэлі і жывапісу, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння

**14 Свентахоўскі Усевалад** (1966 г. Мінск – 2024), мастак, які працаваў у галіне графічнага дызайну, кніжнай графікі, каліграфічнага мастацтва, педагог – 60 гадоў з дня нараджэння

**14 Цэнтральны навукова-даследчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь,** РУП (г. Мінск, 1961) – 65 гадоў з часу стварэння

**14 Шменкель Фрыц** (1916, Польшча – 1944), нямецкі антыфашыст, удзельнік партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза – 110 гадоў з дня нараджэння

**14 Ягоўдзік (сапр. Ягаўдзік) Уладзімір** (1956, в. Кастровічы, Слонім. р-н), пісьменнік, драматург, літаратурны крытык, перакладчык, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Літаратурнай прэміі імя Я. Маўра – 70 гадоў з дня нараджэння

**Кніжныя выставы:**
*Распавядае Уладзімір Ягоўдзік*
*Падарункі ад дзядзькі Ягоўдзіка*

*Для дзяцей і для бацькоў,*
*Маіх даўніх сябрукоў,*
*Што не крыўдзяць птаху, звера,*
*У дабро і казку вераць.*

Уладзімір Ягоўдзік

**14 Герман Ганна** (1936-1982), польская спявачка і кампазітар – 90 гадоў з дня нараджэння

**Тэматычная паліца:**

- Ганна Герман: чароўная, непаўторная, незабыўная

*Мы зачакаліся… Спявайце.*
*(Пласцінка чорная, як рана.)*
*І слоў няма сказаць: "Бывайце!"*
*Нех жые Песня, пані Анна.*

Яўгенія Янішчыц

**15 Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў**

**15 Міжнародны дзень дзяцей, хворых на рак**

**15 Бірала Захар** (1906, в. Раўнаполле, Пухав. р-н – 1993), паэт, сатырык, гумарыст – 120 гадоў з дня нараджэння

**Тэматычная паліца:**

- Кветкі Захара Біралы

*Цвітуць кветкі, цвітуць кветкі –*
*Гэта нашы растуць дзеткі.*

Захар Бірала

**15 Брук Абрам** (1866, г. Гомель – 1941), вучоны-медык, адзін з выбітных афтальмолагаў Бе-

ларусі першай паловы XX ст., удзельнік Першай сусветнай вайны – 160 гадоў з дня нараджэння

**15 Даніловіч Валянцін** (1936, п. Калодзішчы, Мін. р-н – 1970), беларускі і расійскі выпрабавальнік парашутаў і катапультных сістэм, канструктар, майстар спорту СССР, мнагакратны рэкардсмен свету – 90 гадоў з дня нараджэння

**15 Паплаўскі Георгій** (1931, Украіна – 2017), графік, жывапісец, народны мастак Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, акадэмік НАН Беларусі і Расійскай Акадэміі мастацтваў, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Міжнароднай прэміі імя Дж. Неру, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Саюзнай дзяржавы, кавалер ордэна Дружбы народаў – 95 гадоў з дня нараджэння

Кніжна-ілюстрацыйныя выставы:
*Рэалізм – душа мастацтва (Георгій Паплаўскі)*
*Незвычайная прастора ілюстрацыі*

*Па вялікім рахунку – гэта ўжо нават не ілюстраванне, а самастойнае мастацкае пераасэнсаванне літаратурнага тэксту.*

*Георгій Паплаўскі*

**15 Джаліль Муса** (1906-1944), татарскі паэт, ваенны карэспандэнт, Герой Савецкага Саюза – 120 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Мужество останется в веках*

**16 Ляскоў Мікалай** (1831, Расія – 1895), рускі пісьменнік, аўтар раманаў “Няма куды” (1864), “На нажах”, прысвечаных падзеям беларускай гісторыі – 195 гадоў дня нараджэння

**17 Дзень спантаннага праяўлення дабрыні**

Кніжная выстава:
*Хай кожны дзень наш будзе днём праяўлення дабрыні!*

*Літасць, не праганяйце літасць з нашага грамадства, таму што без яе, без літасці, яно разваліцца.*

*Фёдар Дастаеўскі*

**17 Вашчанка Канстанцін** (1961, Малдова), графік, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва – 65 гадоў з дня нараджэння

**17 Інстытут аховы раслін НАН Беларусі,** рэспубліканскае навуковае даччыннае ўнітарнае прадпрыемства (Мін. р-н, 1971) – 55 гадоў з часу стварэння

**17 Тулупаў Уладзімір** (1951, г. Брэст), мастак-жывапісец, педагог – 75 гадоў з дня нараджэння

**17 Тышкевіч Канстанцін** (1806, г. Лагойск – 1868), археолаг, гісторык, этнограф, фалькларыст, краязнаўца, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі, член Віленскай археалагічнай камісіі – 220 гадоў з дня нараджэння

**17 Барто Агнія** (1906-1981), расійская пісьменніца, аўтар вершаў для дзяцей – 120 гадоў з дня нараджэння

Кніжныя выставы:
*Аднакласнікі, сябры, таварышы*
Пытанні ад Агніі Барто
– Што расказалі дзеці з розных краін?
– Ці не пра вас гэтыя радкі?
– Вам падабаецца вучыцца?
– Складана з роднымі паладзіць?

**18 Фельцман Аскар** (1921-2013), кампазітар, народны артыст Расіі – 105 гадоў з дня нараджэння

**19 Сусветны дзень абароны марскіх млекакормячых (Дзень кіта)**

**19 Вашчак Яраслаў** (1921, Украіна – 1989), дырыжор, народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння

**19 Міцяеў Алег** (1956), расійскі бард, музыкант, акцёр, народны артыст Расіі – 70 гадоў з дня нараджэння

**20 Сусветны дзень сацыяльнай справядлівасці**

**20 Мастацкая галерэя Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка** (1981) – 45 гадоў з часу адкрыцця



**8**
**Мележ Іван** (1921, в. Глінішча, Хойн. р-н – 1976), народны пісьменнік Беларусі, грамадскі дзеяч – 105 гадоў з дня нараджэння

**14**
**Ягоўдзік (сапр. Ягаўдзік) Уладзімір** (1956, в. Кастровічы, Слонім. р-н), пісьменнік, драматург, літаратурны крытык, перакладчык – 70 гадоў з дня нараджэння




**15**
**Паплаўскі Георгій** (1931, Украіна – 2017), графік, жывапісец,– 95 гадоў з дня нараджэння





**17**
**Барто Агнія** (1906-1981), расійская пісьменніца, аўтар вершаў для дзяцей – 120 гадоў з дня нараджэння

**21** Міжнародны дзень роднай мовы

**20 Партнова Зінаіда** (1926, Расія – 1944), удзельніца камсамольскага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, імя якой носяць вуліцы Полацка, Обаля, Шуміліна – 100 гадоў з дня нараджэння

**20 Цесакоў Кім** (1936, г. Чэрвень – 2018), кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Літаратурнай прэміі імя В. Віткі, ганаровы грамадзянін Чэрвеня – 90 гадоў з дня нараджэння

**21 Міжнародны дзень роднай мовы** (свята ААН)

Кніжныя выставы:
*Гаворым і чытаем па-беларуску*
*Любі, шануй і ведай сваё слова*
*Гучы, родная мова!*

**21 Сусветны дзень экскурсавода**

**21 Дзень работнікаў землеўпарадкавальнай і картографа-геадэзічнай службы**

**21 Беларуска-расійскае сумеснае прадпрыемства "Брэстгазаапарат"**, ААТ, буйнейшае ў СНД прадпрыемства па выпуску кухонных пліт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (г. Брэст, 1951) – 75 гадоў з часу ўтварэння

**21 Вайнонен Васіль** (1901, Расія – 1964), артыст балета, балетмайстар, які пэўны час быў мастацкім кіраўніком балета Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, заслужаны артыст Расіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР – 125 гадоў з дня нараджэння

**21 Ружанскі пушчабіялагічны заказнік рэспубліканскага значэння** (Пруж. р-н, 1986) – 40 гадоў з часу стварэння

**21 Дэліб Леа** (1836-1891), французскі кампазітар – 190 гадоў з дня нараджэння

**21 Канчалоўскі Пётр** (1876-1956), народны мастак РСФСР – 150 гадоў з дня нараджэння

**22 Міжнародны дзень падтрымкі ахвяраў злачынстваў**

**22 Баравік Марыя** (1946, в. Праабражэнка, Глыб. р-н,), паэтка, аўтар шэрагу паэтычных зборнікаў – 80 гадоў з дня нараджэння

**23 Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь**

**23 Гомельскі абласны музей ваеннай славы,** установа, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2006) – 20 гадоў з часу стварэння

**23 Піятуховіч Міхайла (Міхаіл)** (1891, в. Алексінічы, Сеннен. р-н – 1937), крытык, літаратуразнаўца, педагог, заснавальнік беларускай літаратурнай крытыкі, правадзейны член Інбелкульта – 135 гадоў з дня нараджэння

**23 Шылай Расціслаў** (1936, в. Раўнаполле, Пухав. р-н – 2004), архітэктар, заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння

**Украінка Леся (Косач-Квітка Ларыса)** (1871-1913), украінская пісьменніца, паэтка і перакладчыца – 155 гадоў з дня нараджэння

Кніжныя выставы:
*Леся Украінка: у змаганні з бязлітасным лёсам*

*Найлепшыя – тыя вершы, што пішуць, не гледзячы ні на што.*
Мікалай Забалоцкі

*Калі палкае слова – вострая зброя*

*З Вамі гамоніць абсяг.*
*Раіцца з Вамі прырода.*
*Песня і Песні прасіяг –*
*Леся – легенда народа.*
Яўгенія Янішчыц

**26 Сусветны дзень марудлівасці**

**26 Козел Аляксандр** (1951, в. Лучынскія, Мін. р-н), скульптар, аўтар твораў у манументальнай, станковай і мемарыяльнай скульптуры – 75 гадоў з дня нараджэння

**27 Міжнародны дзень палярнага мядзведзя**

**27 Малей Аляксандр** (1951, в. Садкоўшчына, Верхнядзв. р-н), мастак-абстракцыяніст, тэарэтык мастацтва, жывапісец, графік, педагог – 75 гадоў з дня нараджэння

**27 Млодак Рыта (Рэвека)** (1906, г. Мінск – 1969), артыстка оперы (лірыка-драматычнае сапрана), народная артыстка Беларусі – 120 гадоў з дня нараджэння

**28 Баглай Аляксандр** (1951, г. Бабруйск), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – 75 гадоў з дня нараджэння

**28 Бадак Алесь (Аляксандр)** (1966, в. Туркі, Ляхав. р-н), паэт, празаік, публіцыст, літаратурны крытык, лаўрэат рэспубліканскай літаратурнай прэміі "Залаты Купідон", Міждзяржаўнай прэміі СНД "Зоркі Садружнасці" – 60 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Алесь Бадак на ўсе жанры мастак*

**28 Выдавецкі цэнтр "Марка" РУП "Белпошта"**, структурнае падраздзяленне РУП "Белпошта", лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (г. Мінск, 1996) – 30 гадоў з часу стварэння

**28 Іўлічаў Віктар** (1946, Азербайджан), архітэктар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, сярод асноўных работ якога – станцыя Мінскага метрапалітэна "Інстытут культуры", другая чарга мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" і інш.– 80 гадоў з дня нараджэння

**28 Малахаў Валерый** (1976, г. Салігорск), скульптар, аўтар твораў у станковай скульптуры, дэкаратыўнай і інтэр'ернай пластыцы – 50 гадоў з дня нараджэння

**28 Полінг Лайнус** (1901-1994), амерыканскі хімік, крышталограф, лаўрэат двух Нобелеўскіх прэмій – 125 гадоў з дня нараджэння

## САКАВІК

**1 Сусветны дзень кампліменту**

**1 Сусветны дзень грамадзянская абароны**

**1 Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі,** філіял Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры (г. Мінск, 1931) – 95 гадоў з часу заснавання

**1 "Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,** навукова-даследчая ўстанова (г. Мінск, 1971) – 55 гадоў з часу стварэння

**1 Лук Павел** (1956, в. Жылічы, Камян. р-н), скульптар, які працуе ў манументальнай, станковай і мемарыяльнай скульптуры, творы якога знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, прыватных калекцыях – 70 гадоў з дня нараджэння

**1 Пасюкевіч Уладзімір** (1931, г. Капыль – 2009), жывапісец, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння

**1 Пуставой Яўген** (1946, г. Гомель), мастак, які працуе ў станковай і манументальнай скульптуры – 80 гадоў з дня нараджэння

**1 Савік Лідзія** (1936, в. Камуна, Любан. р-н – 2024), літаратуразнаўца, крытык, культуролаг, даследчык праблем развіцця беларускай літаратуры XX ст., сучаснага літаратурнага працэсу, кандыдат філалагічных навук, член Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі – 90 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Па-свойму паглядзець на творцаў нашых дзён*

*Мы кнігі шчырыя напішам*
*І пракладзём ім шлях належны.*
*Пра гэты свет, святы і грэшны,*
*Мы кнігі шчырыя напішам.*

Васіль Жуковіч

**1 Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г.,** звод законаў феадальнага права (Вялікае Княства Літоўскае; дзейнічаў у 1566-1588 гг.) – 460 гадоў з часу ўступлення ў законную сілу

**1 Стральцоў Барыс** (1926, в. Хутар, Бых. р-н – 2009), журналіст, літаратуразнаўца, пісьменнік, педагог, выдатнік адукацыі Беларусі, выдатнік друку Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне" – 100 гадоў з дня нараджэння

**1 Чартовіч Аляксандр** (1946, Расія – 2015), мастак кіно, жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння

**2 Міжнародны дзень запалкі**

**2 "Віцьбічы"**, гарадская газета, лаўрэат нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ "Залатая Ліцера" (г. Віцебск, 1991) – 35 гадоў з часу выхаду першага нумара

**3 Сусветны дзень дзікай прыроды** (свята ААН)

**3 Сусветны дзень пісьменніка**

Кніжная выстава:
*Пісьменнікі – пра знакамітых калег*

**3 Міжнародны дзень аховы здароўя вуха і слыху**

**3 Аграновіч-Панамарова (Панамарова) Яўгенія** (1936, Украіна – 2022), архітэктар (працавала ў галіне інтэр'ера, архітэктурнай каларыстыкі), доктар архітэктуры, педагог, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – 90 гадоў з дня нараджэння

**3 "Віцязь"**, ААТ, буйнейшае прамысловае мнагапрофільнае прадпрыемства Рэспублікі Беларусь па вырабу тэлевізійнай, бытавой і медыцынскай тэхнікі (г. Віцебск, 1976) – 50 гадоў з часу прыняцця рашэння аб стварэнні прадпрыемства

**4 Дзень міліцыі**

**4 Бабруйскі дзяржаўны механіка-тэхналагічны каледж,** ДУА, якая рыхтуе спецыялістаў у галіне машынабудавання (1966) – 60 гадоў з часу стварэння

**4 Куфко Эдуард** (1921, Расія – 1998), жывапісец, які працаваў у жанрах сюжэтна-тэматычнай карціны, партрэта – 105 гадоў з дня нараджэння

**4 Нячай Вольга** (1936, Расія – 2010), кіназнаўца, кінакрытык, аўтар шматлікіх навуковых прац па праблемах тэорыі кіно і тэлебачання, кінаадукацыі, лаўрэат прэміі Дзяржкамвыда БССР, Саюза кінематаграфістаў СССР, Беларускага саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў – 90 гадоў з дня нараджэння

**4 Рахленка Валянціна** (1931, г. Гомель), піяністка, педагог, адна са стваральніц фартэпіяннай школы Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння

**5 Авіякампанія "Белавія"**, ААТ, лідар пасажырскіх перавозак у Рэспубліцы Беларусь (г. Мінск, 1996) – 30 гадоў з часу ўтварэння

**5 Бярозка (сапр. Фрайман) Міхаіл** (1921, Ельскі р-н – 1992), сцэнарыст, драматург, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння

**5 Гарэлава Галіна** (1951, г. Мінск), кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне музыкі – 75 гадоў з дня нараджэння

**5 Крапіва Кандрат (сапр. Атраховіч Кандрат)** (1896, в. Нізок, Уздз. р-н – 1991), драматург, байкапісец, празаік, мовазнаўца, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, народны пісьменнік Беларусі,

заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы, Герой Сацыялістычнай Працы, узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, удзельнік Першай сусветнай, савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў; яго імя носяць вуліцы ў Мінску, Гродне, Уздзе, Смаргоні – 130 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Багатая спадчына Кандрата Крапівы*
– Байкапісец
– Драматург
– Мовазнаўца

**5 Фей Пётр** (1946, в. Хамічы, Калінкав. р-н), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка), жывапісец-пейзажыст – 80 гадоў з дня нараджэння

**6 Сусветная бацькоўская субота**

**7 Рымскі імператар Канстанцін Вялікі абвясціў нядзелю днём адпачынку** (321) – 1705 гадоў таму

**7 Дзень нараджэння тэлефона: Аляксандр Бэл запатэнтаваў вынайдзены ім тэлефонны апарат** (1876) – 150 гадоў таму

**7 Валошчык Мікалай** (1931, Бяроз. р-н), беларускі народны майстра ў галіне лозапляцення, удзельнік і прызёр шэрагу выставак, конкурсаў, фестываляў народнай творчасці; аўтар зборніка вершаў і перакладаў "Жывіца" – 90 гадоў з дня нараджэння

**7 Фальскі Усевалад** (1886, г. Мінск – 1928), грамадска-палітычны, дзяржаўны і культурны дзеяч, акцёр, адзін са стваральнікаў беларускага прафесійнага тэатра – 140 гадоў з дня нараджэння

**8 Міжнародны жаночы дзень**

Кніжная выстава:
*Жаночы дэтэктыў прызнаны ў свеце*

**8 Роу Аляксандр** (1906-1973), кінарэжысёр, аўтар фільмаў-казак, народны артыст РСФСР – 120 гадоў з дня нараджэння

**9 Сусветны дзень дзі-джэя**

**9 Козенка Мікола (Мікалай)** (1951, г. Мазыр), этнахарэолаг, педагог, рэжысёр, дзеяч аматарскай творчасці, аўтар ідэі, праекта і мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня", мастацкі кіраўнік Узорнага фальклорнага гурта "Берагіня" (Барысаў), лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва – 75 гадоў з дня нараджэння

**10 Гасцюхін Уладзімір** (1946, Расія), акцёр тэатра і кіно, народны артыст Беларусі, заслужаны артыст Расіі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі Расіі, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны – 80 гадоў з дня нараджэння

**10 Супрун Васіль** (1926, в. Глоўсевічы, Слонім. пав., Навагр. ваяв. (цяпер Слонім. р-н) – 2007), краязнаўца, археолаг, гісторык, пісьменнік – 100 гадоў з дня нараджэння

**10 Зацэпін Аляксандр** (1926), расійскі кампазітар, народны артыст Расіі – 100 гадоў з дня нараджэння

**11 Есьман Ларыса** (1936, г. Мінск – 2017), архітэктар, адна з распрацоўшчыкаў Генеральнага плана развіцця Мінска да 2000 г., лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР – 90 гадоў з дня нараджэння

**13 Лейтман Леў** (1896, г. Петрыкаў – 1974), мастак, аўтар лірычных і індустрыяльных пейзажаў, партрэтаў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, педагог, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны – 130 гадоў з дня нараджэння

**13 Раманка Расціслаў** (1936, г. Гомель – 2011), мастак манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісец, педагог, уладальнік знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" – 90 гадоў з дня нараджэння

**13 Таболіч Рыгор** (1956, в. Палосцевічы, Жытк. р-н), жывапісец, які працуе ў жанрах сюжэтна-тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа, нацюрморта, у 2000 г. адкрыў першую прыватную мастацкую галерэю ў Магілёве – 70 гадоў з дня нараджэння

**13 Хабард Рон** (1911-1986), амерыканскі пісьменнік і філосаф, стваральнік дыянэтыкі і саенталогіі – 115 гадоў з дня нараджэння

**14 Міжнародны дзень рэк (Міжнародны дзень дзеянняў супраць плацін)**

**14 Міжнародны дзень ліку "Пі"**

**14 Дзень праваслаўнай кнігі**

**14 Дубашынскі Павел** (1931, в. Гарбуны, Шарк. р-н – 2000), акцёр, народны артыст Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння

**14 Звінагродскі (Звінагародскі) Барыс** (1896, Турцыя – 1982), жывапісец, тэатральны мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 130 гадоў з дня нараджэння

**14 Місько Павел** (1931, в. Знамя, Слуцкі р-н – 2011), пісьменнік, перакладчык, драматург – 95 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Неверагодныя прыгоды з Паўлам Місько*

**14 Палескі драматычны тэатр** (г. Пінск, 2006) – 20 гадоў з пачатку існавання

**15 Сусветны дзень абароны правоў спажыўцоў**

**15 Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь**

**16 Пабачыў свет раман Віктора Гюго "Сабор Парыжскай Божай Маці"** (1831) – 195 гадоў таму

**16 Гарэлік Любоў** (1941, в. Хацянаўшчына, Мін. р-н), літаратуразнаўца, даследчык пытанняў сучаснага літаратурнага працэсу, аўтар навуковых прац, прысвечаных творчасці А. Пысіна, Р. Барадуліна, П. Броўкі, А. Звонака, М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, Я. Янішчыц і інш. – 85 гадоў з дня нараджэння

**16 Кірычэнка Мікалай** (1946, г. Маладзечна – 2018), акцёр тэатра і кіно, народны артыст Беларусі,

лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, тэатральнай прэміі імя І. Буйніцкага, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, педагог – 80 гадоў з дня нараджэння

**16 Пушкін Уладзімір** (1936, г. Горкі), беларускі архітэктар, сярод асноўных работ якога – серыі пяці- і дзевяціпавярховых буйнапанэльных жылых дамоў для гарадоў Беларусі, комплекс будынкаў па вул. Сурганава, В. Харужай у Мінску – 90 гадоў з дня нараджэння

**17 Голанд Ян Давід** (1746, Германія – 1827), польскі кампазітар і дырыжор, прыдворны кампазітар і капельмайстар Нясвіжскай капэлы Радзівілаў у канцы XVIII ст., аўтар опер, балета, кантаты, сімфоніі, паланэзаў, серэнад – 280 гадоў з дня нараджэння

**17 Лапчынскі Леанід** (1936, г. Мінск – 1994), мастак, які працаваў у станковым жывапісе, аўтар партрэтаў, пейзажаў, абстрактных кампазіцый, педагог – 90 гадоў з дня нараджэння

**17 Лісоўскі Міхаіл** (1931, в. Белы Мох, Мсцісл. р-н – 1970), жывапісец, графік, які працаваў у жанрах партрэта, пейзажа, карціны, нацюрморта, педагог – 95 гадоў з дня нараджэння

**18 Дзень унутраных войскаў**

**18 Дзень Парыжскай камуны**

**19 Міжнародны дзень кліента**

**19 Інстытут філасофіі НАН Беларусі**, дзяржаўная навуковая ўстанова, вядучы навукова-экспертны цэнтр Беларусі ў галіне філасофскіх ведаў (г. Мінск, 1931) – 95 гадоў з часу стварэння

**19 Кісялёў Генадзь** (1931, Расія – 2008), вучоны-гісторык, літаратуразнаўца, пісьменнік, археограф, архівіст, які пакінуў вялікую навуковую і творчую спадчыну па пытаннях грамадскай думкі Беларусі XIX ст., гісторыі беларускай культуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа – 95 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Выбітныя беларусы на старонках кніг Генадзя Кісялёва*

**19 Сурма Генадзь** (1946, г. п. Глуск, Глускі р-н – 2002), мастак, які працаваў у станковым жывапісе і акварэлі ў жанрах пейзажа і нацюрморта – 80 гадоў з дня нараджэння

**20 Міжнародны дзень шчасця** (свята ААН)

**20 Дзень Зямлі**

**20 Дзень французскай мовы (Міжнародны дзень франкафоніі)** (свята ААН)

**20 Міжнародны дзень без мяса**

**20 Абрамчык (дзявочае Ляўковіч) Ніна** (1916, в. Шані, Пруж. р-н – 2004), грамадска-палітычная дзяячка, пісьменніца, выдавец – 105 гадоў з дня нараджэння

**20 Кульбак Майсей** (1896, г. Смаргонь – 1937), яўрэйскі пісьменнік, аўтар паэтычных, празаічных і драматургічных твораў, перакладчык – 130 гадоў з дня нараджэння

**20 Чумакоў Ігар** (1961, г. п. Бягомль, Докш. р-н), скульптар, аўтар твораў у манументальнай, станковай і мемарыяльнай скульптуры – 65 гадоў з дня нараджэння

**21 Сусветны дзень паэзіі** (свята ААН)

**21 Міжнародны дзень лялечніка**

**21 Сусветны дзень людзей з сіндромам Даўна**

**21 Міжнародны дзень лясоў** (свята ААН)

Кніжныя выставы:
*Лес – народная святыня і нацыянальнае багацце*
*Лясныя наглядчыкі, захавальнікі і абаронцы*

*Лес высокі з глыбокім карэннем…*
*Не палохайце лес вынішчэннем!*
Віктар Шніп

**21 Верхневілейскі гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння** (Докш. р-н; створаны ў 1996 г.) – 30 гадоў з часу стварэння

3
Сусветны дзень пісьменніка



21
Сусветны дзень паэзіі (свята ААН)



5
Крапіва Кандрат (сапр. Атраховіч Кандрат) (1896, в. Нізок, Узд. р-н – 1991), драматург, байкапісец, празаік – 130 гадоў з дня нараджэння

20
Дзень Зямлі



14 Дзень праваслаўнай кнігі



**21** **Сіньша, ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння** (Расон. р-н, 1996) – 30 гадоў з часу стварэння

**22** **Сусветны дзень водных рэсурсаў**

**22** **Дзень Балтыйскага мора**

**22** **Міжнародны дзень таксіста**

**22** **Зарыцкі Аляксей** (1911, г. п. Хоцімск – 1987), паэт, перакладчык – 115 гадоў з дня нараджэння

**22** **Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь,** кіруючы орган алімпійскага руху ў Беларусі, прадстаўнічая арганізацыя Беларусі ў Міжнародным алімпійскім камітэце (1991) – 35 гадоў з часу стварэння

Кніжная выстава:
*Беларускія зоркі алімпійскага руху*

**23** **Сусветны метэаралагічны дзень**

**23** **Упершыню на футбольных варотах выкарыстана сетка** (1891) – 135 гадоў таму

**23** **Мінкус Людвіг** (1826-1917), аўстрыйскі кампазітар, скрыпач і дырыжор – 200 гадоў з дня нараджэння

**23** **Бяляўскі Анатоль** (1961, Грод. вобл.), жывапісец – 65 гадоў з дня нараджэння

**23** **Любан Ісак** (1906, г. Чэрыкаў – 1975), кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР – 120 гадоў з дня нараджэння

**24** **Сусветны дзень барацьбы з сухотамі**

**24** **Шульжэнка Клаўдзія** (1906-1984), расійская эстрадная спявачка, актрыса тэатра і кіно, народная артыстка СССР – 120 гадоў з дня нараджэння

**24** **Маслоўская (дзявочае Матэйчук) Вера** (1896, в. Агароднічкі, Беластоцкі пав., Грод. губ. (цяпер Падляшскае ваяв., Польшча) – 1981), грамадска-палітычны і культурны дзеяч, адна з пачынальніц жаночага руху ў Беларусі, паэтка – 130 гадоў з дня нараджэння

**26** **Фіялетавы дзень (Дзень хворых на эпілепсію)**

**26** **Тэнэсі Уільямс** (1911-1983), амерыканскі празаік і драматург – 115 гадоў з дня нараджэння

**26** **Булдакоў Аляксей** (1951-2019), акцёр тэатра і кіно, народны артыст Расіі – 75 гадоў з дня нараджэння

**26** **Грашчанкаў Мікалай** (1901, в. Забор'е, Мсцісл. пав., Магіл. губ. (цяпер Расія) – 1965), вучоны-неўролаг і нейрахірург, арганізатар навукі, адзін з пачынальнікаў навуковых даследаванняў у галіне нейрахірургіі ў Беларусі, акадэмік НАН Беларусі і АМН СССР, член-карэспандэнт АН СССР, кавалер ордэна Леніна, удзельнік Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў – 125 гадоў з дня нараджэння

**26** **Калінкавіцкі краязнаўчы музей,** дзяржаўная ўстанова культуры (1991) – 35 гадоў з часу стварэння (адкрыты 14.01.1994 г.)

**27** **Сусветны дзень тэатра**

**27** **Апрабаваная першая паравая пажарная машына** (1841) – 185 гадоў таму

**27** **Данелія Леанід** (1946, г. Брэст), мастак у галіне мастацкага афармлення і праектавання, манументальна-дэкаратыўнага і станковага жывапісу, педагог – 80 гадоў з дня нараджэння

**27** **Мухарынская Лідзія** (1906, Грузія – 1987), музыказнаўца-фальклярыст, этнамузыколаг, педагог, стваральніца беларускай этнамузыказнаўчай школы, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 120 гадоў з дня нараджэння

**27** **Сапуноў Аляксей** (1851, мяст. Усвяты, Віцеб. губ. (цяпер Расія) – 1924), гісторык, археограф, архівіст, краязнаўца, аўтар прац па гісторыі Віцебшчыны, член-карэспандэнт Маскоўскага археалагічнага таварыства, сапраўдны член Рускага геаграфічнага таварыства – 175 гадоў з дня нараджэння

**27** **Якерсон Давід** (1896, г. Віцебск – 1947), скульптар, графік, мастак-афарміцель – 130 гадоў з дня нараджэння

**28** **Гумен Фелікс** (1941, Расія), жывапісец, які працуе ў жанрах пейзажа, нацюрморта, партрэта, адзін з заснавальнікаў Віцебскай школы акварэлі – 85 гадоў з дня нараджэння

**28** **Паралімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь,** грамадскае аб'яднанне, мэтай якога з'яўляецца далучэнне спартсменаў-інвалідаў да актыўнага грамадскага жыцця, садзейнічанне іх інтэграцыі ў сучаснае грамадства сродкамі фізічнай культуры і спорту (г. Мінск, 1996) – 30 гадоў з часу стварэння

Тэматычная паліца:
- Спорт, у якім кожны – пераможца

**29** **Дзень нараджэння «Кока-Колы»,** створаны рэцэпт гэтага папулярнага ў свеце напою (1886) – 140 гадоў таму

**29** **Атрашкевіч Алена** (1966, г. Барысаў), кампазітар, аўтар музычна-тэатральных і вакальна-сімфанічных твораў, музычна-сцэнічных кампазіцый, педагог, дзяржаўны дзеяч, уладальніца знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры" – 60 гадоў з дня нараджэння

**29** **Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў,** установа, дзе зберагаюцца ўнікальныя аўдыявізуальныя дакументальныя помнікі, якія адлюстроўваюць гістарычныя падзеі ў Беларусі з канца XIX ст. і да цяперашняга часу (г. Дзяржынск, 1941) – 85 гадоў з часу стварэння

**29** **Інстытут глебазнаўства і аграхіміі,** рэспубліканскае навуковае дачыннае ўнітарнае прадпрыемства ў складзе Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па глебазнаўству" (г. Мінск, 1931) – 95 гадоў з часу стварэння

**29** **Інстытут эканомікі НАН Беларусі,** дзяржаў-

ная навуковая ўстанова (г. Мінск, 1931) – 95 гадоў з часу стварэння

**29 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытут эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча НАН Беларусі,** дзяржаўная навуковая ўстанова (г. Мінск, 1931) – 95 гадоў з часу заснавання

**29 Фізіка-тэхнічны інстытут НАН Беларусі,** дзяржаўная навуковая ўстанова (г. Мінск, 1931) – 95 гадоў з часу стварэння

**29 Гаварухін Станіслаў** (1936-2018), акцёр, кінарэжысёр, сцэнарыст, грамадскі дзеяч, народны артыст Расіі – 90 гадоў з дня нараджэння

**30 Ігнаценка Трафім** (1916, в. Рудня Споніцкая, Ветк. р-н – 1984), мастак-графік, плакатыст – 110 гадоў з дня нараджэння

**30 Лялько Хрысціна** (1956, в. Хадзюкі, Лід. р-н), пісьменніца, аўтар аповесцяў, апавяданняў, вершаў і казак, перакладчыца, журналістка, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Калі душа – хрысціянка*

**30 Гойя Франсіска** (1746-1828), іспанскі мастак, гравёр – 280 гадоў з дня нараджэння

**31 Міжнародны дзень рэзервовага капіравання (Дзень бэкапу)**

**31 Несцярэўскі Мікалай** (1931, Польшча – 2021), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка, скульптура), творы якога экспануюцца ў фондах Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь і іншых музеях Беларусі і за яе межамі, знаходзяцца ў многіх грамадскіх памяшканнях і прыватных аматарскіх калекцыях, аўтар дэкаратыўных пано і скульптур, якія ўпрыгожваюць станцыю метро "Плошча Якуба Коласа" ў Мінску – 95 гадоў з дня нараджэння

**31 Яршоў Міхаіл** (1961, г. Мінск), скульптар, аўтар твораў у манументальнай і мемарыяльнай скульптуры – 65 гадоў з дня нараджэння

**31 Дэкарт Рэнэ** (1596-1650), французскі філосаф, матэматык, фізік, фізіёлаг – 430 гадоў з дня нараджэння

**31 Увядзенскі Аляксандр** (1856-1925), расійскі філосаф, псіхолаг, логік – 170 гадоў з дня нараджэння




*Художник Л. Владимирский*

**Т. КОВАЛЬЧУК**
заведующий библиотекой
ГУО «Гимназия № 2
г. Волковыска»

# БУРАТИНО
## и функциональная читательская грамотность

Важное место в чтении учащихся занимает функциональная читательская грамотность. В начальной школе читательскую грамотность можно развивать на всех уроках и на всех предметах. Но, конечно, проще всего это делать, когда учащиеся читают книги по внеклассному чтению и потом их обсуждают на уроке литературного чтения. А для нас, библиотекарей, это проведение мероприятий, их разных форм и методов. На литературном часе, обсуждении книги, на викторине нужно придумать такие задания и вопросы, чтобы учащиеся подумали и связали проблемы и ситуации из книги с современной жизнью. Нужно находить основные и главные признаки функциональной грамотности.



# КАЛЯНДАР знамянальных і памятных дат на II квартал 2026 года

## КРАСАВІК

**1 Дзень гумару**

**1 Міжнародны дзень птушак**

**Кніжныя выставы:**

***Ім патрэбна наша абарона***

*Сёння ахоўваць птушак – значыць змагацца за чалавечнасць, абуджаць у чалавеку чалавечнасць.*

Уладзімір Ягоўдзік

***З птушынымі песнямі неба жывое***

*Спяшайцеся ў поле, у луг, у лясы –*
*Слухаць птушыныя галасы!*

Васіль Вітка

**1 Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт**, ВНУ, буйны навукова-вучэбны цэнтр Беларусі (1966) – 60 гадоў з часу адкрыцця

**1 Здановіч Юзаф Стэфан** (1786-1839), польскі камедыйны акцёр, спявак, які пэўны час працаваў у Беларусі – 240 гадоў з дня нараджэння

**1 Ландарскі Роберт** (1936, г. Гомель), жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, аўтар пейзажаў, сюжэтна-тэматычных твораў – 90 гадоў з дня нараджэння

**1 Літаратурны музей Максіма Багдановіча**, ДУ, філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры (г. Мінск, 1981 г.; адкрыўся для наведвальнікаў 8 снежня 1991 г.) – 45 гадоў з часу стварэння

**1 Марчанка Леанід** (1941, г. Бабруйск – 1996), графік, творы якога ўпрыгожваюць Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Трацякоўскую галерэю ў Маскве, Музей сучаснага мастацтва ў Кёльне і іншыя ўстановы Беларусі і замежжа, уладальнік прэмій і дыпломаў Саюза мастакоў СССР – 85 гадоў з дня нараджэння

**1 "Народная асвета", выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства** (г. Мінск, 1951) – 75 гадоў з часу заснавання

**1 Якаўлеў Аляксандр** (1906-1989), расійскі авіяканструктар, стваральнік знакамітых знішчальнікаў "Як" – 120 гадоў з дня нараджэння

**2 Міжнародны дзень дзіцячай кнігі**

**Кніжныя выставы:**

***Казачнікі свету***

***Любімыя кнігі многіх пакаленняў***

**2 Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі**

**2 Лундстрэм Алег** (1916-2005), джазавы музыкант, дырыжор, кампазітар, народны артыст РСФСР – 110 гадоў з дня нараджэння

**Тэматычныя паліцы:**

- Легендарная асоба сусветнага джаза
- Алег Лундстрэм: неверагодны лёс пад гукі джаза

**3 Белагорцаў Ігар** (1911, Расія – 1996), архітэктар, вучоны, педагог, даследчык помнікаў Беларусі, старажытнага Смаленска, архітэктуры і горадабудаўніцтва Беларусі, першы рэктар Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта – 115 гадоў з дня нараджэння

**3 Валынец Мікалай** (1921, Слуцкі р-н – 2003), жывапісец, майстар пейзажа, адзін з лепшых партрэтыстаў Беларусі, стваральнік галерэі партрэтаў Герояў Савецкага Саюза, вядомых дзеячаў культуры, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, сям'ю медалямі – 105 гадоў з дня нараджэння

**3 Смольскі Рычард** (1946, г. Ліда), тэатразнаўца, тэатральны крытык, педагог, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – 80 гадоў з дня нараджэння

**3 Мэрфі Эдзі** (1961), амерыканскі кінаакцёр, рэжысёр, прадзюсар, спявак – 65 гадоў з дня нараджэння

**4 Дзень Інтэрнэту (Дзень святога Ісідара – апякуна Інтэрнэту)**

**4 Дзень вэб-майстра**

**4 Сусветны дзень пацука**

**4 Крэнь Платон** (1896, в. Ярашоўка, Баранав. р-н – 1962), паэт, мемуарыст, публіцыст, удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў – 130 гадоў з дня нараджэння

**4 Русак Васіль** (1896, в. Ячава, Слуцкі р-н – 1946), грамадска-палітычны дзеяч, фалькларыст, выдавец, удзельнік Першай сусветнай вайны – 130 гадоў з дня нараджэння

**4 Скірмунт Амброжы Вінцэнт** (1776-1840), дзяржаўны дзеяч – 250 гадоў з дня нараджэння

**4 Тармола (Тармола-Мірскі) Раман** (1936, г. п. Мір, Карэл. р-н – 2011), паэт, рэдактар, сцэнарыст – 90 гадоў з дня нараджэння

**5 Міжнародны дзень супу**

**Кніжныя выставы:**

***Калі суп – прастора для творчасці***

***Любімая страва***

***Супы, звычайныя і экзатычныя***

**5 Май Рышард** (1936, Клецкі р-н), мастак, працы якога знаходзяцца ў дзяржаўных музеях і прыватных калекцыях Беларусі, ЗША, Германіі, Францыі, Польшчы і іншых краін, заснавальнік і кіраўнік дзіцячай мастацкай студыі Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "АРТ" г. Мінска, выхаванцы якой з'яўляюцца шматразовымі дыпламантамі і прызёрамі міжнародных конкурсаў дзіцячай творчасці – 90 гадоў з дня нараджэння

**5 Палескі дзяржаўны ўніверсітэт**, УА (г. Пінск, 2006 г.; у выніку рэарганізацыі Пінскага дзяржаўнага вышэйшага банкаўскага каледжа Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь) – 20 гадоў з часу стварэння

**5 Пуцейка Аляксандр** (1941, г. Мінск – 2004), мастак, які працаваў у розных жанрах станковага жывапісу: фігуратыўнай карціны, партрэта, пейзажа, нацюрморта, а таксама ў акварэлі – 85 гадоў з дня нараджэння

**5 Эрын Барыс** (1921, Расія – 2008), рэжысёр, які пэўны час быў галоўным рэжысёрам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы і мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны (1984) – 105 гадоў з дня нараджэння

**6 Казлова Вікторыя** (1936, г. Беразіно – 2005), рэжысёр тэатра лялек, чые пастаноўкі атрымалі ўзнагароды на ўсесаюзных і міжнародных фестывалях тэатраў лялек, педагог – 90 гадоў з дня нараджэння

**6 Коўтун (па мужу Новік) Валянціна** (1946, в. Дземяхі, Рэчыцкі р-н – 2011), пісьменніца, крытык, даследчыца пытанняў фальклору ў сучаснай беларускай паэзіі, праблем перакладаў з рускай і ўкраінскай моў, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова – 80 гадоў з дня нараджэння

**Кніжныя выставы:**

***Гераіні Валянціны Коўтун***

*Кветку белую – Беларусь*
*Прытуліла да сэрца жанчына.*
*Валянціна Коўтун*

***Узгадваючы Валянціну Коўтун***

*Яна была мэтанакіраваная і апантаная беларушчынай.*
*Васіль Жуковіч*

**6 Саўчанка Аркадзь** (1936, г. Віцебск – 2004), артыст оперы (барытон), народны артыст Беларусі і СССР – 90 гадоў з дня нараджэння

**6 Сянько Фёдар** (1936, в. Казлякевічы, Баранав. р-н – 2020), работнік сельскай гаспадаркі, дзяржаўны дзеяч Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер ордэна Леніна – 90 гадоў з дня нараджэння

**6 Шупенька Генадзь** (1936, в. Падбярэззе, Мядзел. р-н – 2010), крытык, літаратуразнаўца, перакладчык, даследчык творчасці І. Мележа, Я. Брыля, Я. Скрыгана, Т. Хадкевіча, П. Місько, І. Пташнікава, А. Кудраўца, Ф. Янкоўскага, У. Калесніка і іншых – 90 гадоў з дня нараджэння

**6 Скліфасоўскі Мікалай** (1836-1904), расійскі лекар, хірург, прафесар – 190 гадоў з дня нараджэння

**6 Міжнародны дзень спорту на карысць развіцця і міру** (свята ААН)

**6 Сусветны дзень настольнага тэнісу**

**7 Сусветны дзень здароўя** (свята ААН)

**7 Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі,** грамадскае аб'яднанне (1926) – 100 гадоў з часу стварэння

**7 Вайнштэйн Абрам** (1916, г. Мінск – 1990), мастак, які працаваў у станковым жывапісе ў жанрах партрэта і карціны, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны – 110 гадоў з дня нараджэння

**7 Кагадзееў Аляксей** (1926, Украіна – 1997), харавы дырыжор, педагог, народны артыст Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння

**8 Дзень супрацоўнікаў ваенных камісарыятаў**

**8 Міжнародны дзень цыган**

**8 Гарцуева Валянціна** (1986, г. Мінск), актрыса тэатра і кіно, уладальніца прыза Беларускага саюза тэатральных дзеячаў "Крыштальная Кветка" – 40 гадоў з дня нараджэння

**8 Тамерлан** (1336-1405), сярэднеазіяцкі дзяржаўны і ваенны дзеяч – 690 гадоў з дня нараджэння

**9 Ліманоўскі Янка (Іван)** (1896, Мёрскі р-н – 1989), пісьменнік, літаратуразнаўца, тэа-

**15**
**Гумілёў Мікалай (1886–1921), расійскі паэт, літаратурны крытык – 140 гадоў з дня нараджэння**






**20**
**Беларускі тэатр "Лялька" (г. Віцебск, заснаваны ў 1985 г.) – 40 гадоў з часу першага спектакля**

**23**
**Бядуля Змітрок (1886–1941), пісьменнік – 140 гадоў з дня нараджэння**



тральны дзеяч – 130 гадоў з дня нараджэння

**9 Бадлер Шарль** (1821-1867), французскі паэт і крытык, класік французскай і сусветнай літаратуры – 205 гадоў з дня нараджэння

**10 Міжнародны дзень руху Супраціву**

**10 Дзень братоў і сясцёр**

Кніжныя выставы:

*Які ты брат? Якая ты сястра?*

*Пра братоў і сясцёр – з усмешкай*

**10 Чыгрын Іван** (1931, Слонім. р-н – 2006), літаратуразнаўца, крытык, паэт – 95 гадоў з дня нараджэння

**11 Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў**

**11 Церабун Уладзімір** (1946, в. Несцяняты, Смарг. р-н), скульптар, графік, жывапісец, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ганаровы грамадзянін Смаргоні – 80 гадоў з дня нараджэння

**12 Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі**

Кніжная выстава:

*Касманаўты-беларусы*

**12 Пасха праваслаўная**

**12 Дзербянёў Леанід** (1931-1995), расійскі паэт-песеннік – 95 гадоў з дня нараджэння

**12 Брэгман Авель** (1906, аг. Людзяневічы, Жытк. р-н – 1958), архітэктар, сярод асноўных работ якога (у суаўтарстве): жылыя дамы і гасцініца "Дняпро" (Магілёў), жылыя дамы па праспекце Незалежнасці, будынкі Белпрамсавета, Прамэнергапраекта, Беларускага інстытута фізкультуры (Мінск), педагог – 120 гадоў з дня нараджэння

**12 Гурло Ніна** (1946, г. Мінск), графік, сцэнограф, мастак па касцюмах для тэатра і кіно – 80 гадоў з дня нараджэння

**13 Сусветны дзень рок-н-ролу**

Кніжная выстава:

*Рок-н-рол: пра куміраў самых розных*

**13 Гродзенская епархія**, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Рымска-Каталіцкага Касцёлу ў Беларусі (1991) – 35 гадоў з часу стварэння

**13 Курашова Святлана** (1956, г. Асіповічы), мастачка, якая працуе ў акварэлі ў жанрах пейзажа, нацюрморта, партрэта – 70 гадоў з дня нараджэння

**13 Матулевіч (Матулайціс, Матулявічус) Юрый (Юргіс, Ежы) Баляслаў Банавентура** (1871, Літва – 1927), дзеяч Рымска-Каталіцкага Касцёлу Літвы і Заходняй Беларусі, біскуп Віленскі, блажэнны – 155 гадоў з дня нараджэння

**13 Мінска-Магілёўская архідыяцэзія**, адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Рымска-Каталіцкай Царквы ў Беларусі (Мінская і Магілёўская вобласці; створана Ватыканам у 1991 г.) – 35 гадоў з часу стварэння

**14 Нікіцін Віктар** (1951, г. Брэст), архітэктар, сярод асноўных работ якога – праекты галоўнага корпуса Беларускага педагагічнага ўніверсітэта, падземнага гандлёвага цэнтра "Сталіца", гасцініцы "Еўропа", помніка Т. Шаўчэнку (г. Мінск), заслужаны архітэктар Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння

**15 Міжнародны дзень культуры**

**15 Дзень экалагічных ведаў**

**15 Гумілёў Мікалай** (1886-1921), расійскі паэт, літаратурны крытык, падарожнік – 140 гадоў з дня нараджэння

Кніжныя выставы:

*Поэт, путешественник, воин Николай Гумилев*

*Анна Ахматова и Николай Гумилёв*

**15 Сямёнаў Мікалай** (1896-1986), расійскі хімік, адзін з заснавальнікаў хімічнай фізікі, Нобелеўскі лаўрэат – 130 гадоў з дня нараджэння

**16 Сусветны дзень голасу**

**16 Гладкая Валянціна** (1956, в. Праснакі, Капыл. р-н), спявачка, стваральніца і мастацкі кіраўнік заслужанага аматарскага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля "Неруш" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, збіральніца фальклору, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння

**16 Івацэвіцкі ільнозавод,** ААТ (1971) – 55 гадоў з часу заснавання

**16 “Пралеска (Дашкольная адукацыя)”**, штомесячны навукова-метадычны ілюстраваны часопіс (г. Мінск, 1991 г.) – 35 гадоў з часу стварэння (выдаецца са жніўня 1991 г.)

**16 Шылінг Павел** (1786-1837), расійскі навуковец, усходазнавец і вынаходнік – 240 гадоў з дня нараджэння

**16 Ніканенка Сяргей** (1941), акцёр тэатра і кіно, рэжысёр, народны артыст РСФСР – 85 гадоў з дня нараджэння

**17 Сусветны дзень гемафіліі**

**17 Варонка Язэп (Іосіф)** (1891, Сакольскі пав., Грод. губ.– 1952), дзеяч нацыянальнага руху, палітычны дзеяч, журналіст, публіцыст – 135 гадоў з дня нараджэння

**17 “Дзяржынава”**, мемарыяльны комплекс, уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Стаўб. р-н, 2006 г.) – 20 гадоў з часу заснавання

**17 Кадзетава Валянціна** (1951, Добруш. р-н), пісьменніца – 75 гадоў з дня нараджэння

**17 Мінскі маргарынавы завод,** ААТ, адно з буйнейшых прадпрыемстваў алейна-тлушчавай галіны (г. Мінск, 1951) – 75 гадоў з часу выпуску першай прадукцыі

**17 Радзівілаў Уладзімір** (1961, г. Узда), артыст гутарковага жанру, парадыст, заслужаны артыст Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны – 65 гадоў з дня нараджэння

**17 Рудкоўскі Міхась (Міхаіл)** (1936, в. Востраў, Ганц. р-н – 1991), паэт, перакладчык – 90 гадоў з дня нараджэння

**18 Міжнародны дзень цырка** – трэцяя субота

**18 Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін**

Кніжныя выставы:

*Библейские герои и события в камне и бронзе*

*Белорусская классика в бронзе*

*Сусветная спадчына Беларусі*

**18 Сусветны дзень радыёаматара**

**18 Дзень пралескі**

**18 Ларчанка Барыс** (1941, г. Мінск – 1994), заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР, сярод асноўных работ якога – станцыя метрапалітэна “Плошча Перамогі”, рэканструкцыя Плошчы Перамогі (Мінск), аэравакзальны комплекс аэрапорта “Мінск-2” – 85 гадоў з дня нараджэння

**18 Туроўская Галіна** (1956, былая в. Забінне, Петрык. р-н), мастачка, якая працуе ў розных жанрах станковага жывапісу: партрэце, пейзажы, нацюрморце, педагог, аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў – 70 гадоў з дня нараджэння

**19 Аракчэеў Барыс** (1926, Расія – 2013), жывапісец, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны – 100 гадоў з дня нараджэння

Тэматычныя паліцы:

- Толькі мастацтва, толькі праца
- Правілы жыцця Барыса Аракчэева

**19 Ігнатоўскі Усевалад** (1881, в. Такары, Камян. р-н – 1931), вучоны-гісторык, аўтар адной з першых абагульненых прац па гісторыі Беларусі “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі” (1919), акадэмік НАН Беларусі і АН Украіны, першы прэзідэнт НАН Беларусі, грамадскі і палітычны дзеяч – 145 гадоў з дня нараджэння

Кніжныя выставы:

*Усевалад Ігнатоўскі: патрыёт, вучоны, палітык*

*У гонар Усевалада Ігнатоўскага*

*Першы прэзідэнт Акадэміі навук*

**20 Дзень кітайскай мовы** (свята ААН)

Кніжныя выставы:

*Тысячы аблічча ў Кітая*

*Чаму кітайцы навучылі свет*

**20 Апублікавана першае ў гісторыі літаратуры дэтэктыўнае апавяданне “Забойства на вуліцы Морг” Эдгара По** (1841) – 185 гадоў таму

**20 Беларускі тэатр “Лялька”**, тэатральна-відовішчная ўстанова, заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь (г. Віцебск, 1986; заснаваны ў 1985 г.) – 40 гадоў з часу першага спектакля

**20 Волкаў Валянцін** (1881, Расія – 1964), жывапісец, педагог, народны мастак Беларусі – 145 гадоў з дня нараджэння

Тэматычныя паліцы:

- З размахам жыццялюба
- Страты і набыткі Валянціна Волкава

**20 Завіша Крыштоф Станіслаў** (1666, в. Горка, Слонім. пав.– 1721), польскі пісьменнік-мемуарыст, перакладчык, аратар, дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага – 360 гадоў з дня нараджэння

**20 Зражэўскі Васіль** (1776, Расія – 1837), магілёўскі губернскі архітэктар – 250 гадоў з дня нараджэння

**20 Ісачанка Уладзімір** (1956, г. п. Касцюкоўка, Гомел. р-н), мастак, які працуе ў станковым жывапісе ў жанрах пейзажа, нацюрморта, партрэта, кніжнай графіцы, педагог – 70 гадоў з дня нараджэння

**21 Сусветны дзень творчасці і інавацыйнай дзейнасці**

**21 “Чырвоная змена”**, газета (г. Мінск, 1921) – 105 гадоў з часу выхаду першага нумару

**21 Брантэ Шарлота** (1816-1855), англійская паэтка і раманістка – 210 гадоў з дня нараджэння

**22 Міжнародны дзень Маці-Зямлі** (свята ААН)

**22 Завод горнага воску,** ААТ, інавацыйнае прадпрыемства па вытворчасці шырокага асартыменту нафтахімічнай прадукцыі для розных галін

прамысловасці, адзіны вытворца парафіну на тэрыторыі Беларусі (г. п. Свіслач, Пухав. р-н, 1961 г.) – 65 гадоў з часу выпуску першай прадукцыі

**22 Спірыдовіч Алена** (1961, г. Мінск), дыктар беларускага тэлебачання, заслужаная артыстка Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны – 65 гадоў з дня нараджэння



**22 Федасеенка Уладзімір** (1926, былы х. Бор, Жлоб. р-н – 2018), пісьменнік, аўтар апавяданняў, эсэ, фельетонаў – 100 гадоў з дня нараджэння

**22 Сталь Жэрмена дэ** (1766-1817), французская пісьменніца і публіцыстка – 260 гадоў з дня нараджэння

**23 Сусветны дзень кнігі і аўтарскага права** (свята ААН)

**23 Дзень англійскай мовы** (свята ААН)

**23 Дзень іспанскай мовы** (свята ААН)

**23 Бядуля Змітрок (сапр. Плаўнік Самуіл)** (1886, в. Пасадзец, Лагойскі р-н – 1941), пісьменнік, чые творы ўвайшлі ў гісторыю беларускай літаратуры, сталі каштоўным здабыткам духоўнай культуры народа, перакладзены на мовы народаў блізкага і далёкага замежжа, імем якога названы вуліцы ў Мінску, Віцебску, Жабінцы, Маладзечне – 140 гадоў з дня нараджэння

**Кніжная выстава:**

***Пісьменнік, філосаф, гуманіст***

*Думы, дзеці душы маёй, мне спакою не даюць.*

Змітрок Бядуля

**23 Ксяндзоў Рыгор** (1916, в. Рэчкі, Гомел. пав., Магіл. губ. (цяпер Ветк. р-н – 2006), лётчык, удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза – 110 гадоў з дня нараджэння

**23 Міхайлоўскі Уладзімір** (1931, г. Бабруйск – 1999), жывапісец – 95 гадоў з дня нараджэння

**24 Міжнародны дзень шматбаковасці і дыпламатыі ў імя міру**

**24 Аляксандр Вюртэмбергскі (герцаг Аляксандр Фрыдрых Карл)** (1771, Францыя – 1833), расійскі дзяржаўны і ваенны дзеяч, які пэўны час быў віцебскім і магілёўскім ваенным губернатарам, генерал ад кавалерыі –255 гадоў з дня нараджэння

**25 Міжнародны дзень ДНК**

**25 Дзень дачкі**

**25 Сусветны дзень пінгвінаў**

**26 Сусветны дзень пародненых гарадоў** – апошняя нядзеля

**26 Міжнародны дзень інтэлектуальнай уласнасці**

**26 Міжнародны дзень памяці аб Чарнобыльскай катастрофе** (свята ААН)

**26 Адбылася аварыя на Чарнобыльскай АЭС** (1986) – 40 гадоў таму

**26 Нафрановіч Аркадзь** (1936, в. Юшкавічы, Мядзел. р-н – 2015), пісьменнік, аўтар вершаў, паэм, апавяданняў, аповесцяў, нарысаў – 90 гадоў з дня нараджэння

**26 Чартарыйскі Міхал (Міхаіл) Фрыдэрык** (1696-1775), дзяржаўны і палітычны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага – 330 гадоў з дня нараджэння

**26 Тукай Габдула** (1886-1913), татарскі паэт, літаратурны крытык, публіцыст і перакладчык – 140 гадоў з дня нараджэння

**Тэматычная паліца:**

- Зорка татарскай літаратуры Габдула Тукай

**27 Башлакоў Міхась (Міхаіл)** (1951, в. Баштан, Гомел. р-н), паэт, выдатнік друку Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Літаратурнай прэміі Баяна – 75 гадоў з дня нараджэння

**Тэматычная паліца:**

- Калі шчыміць душа

*Паэзія – катэгорыя вечнасці. Яе нельга ні адмяніць, ні забараніць. Яе нельга нейкім рашэннем штучна павысіць ці панізіць яе статус. Паэзія альбо ёсць, альбо яе няма.*

Міхась Башлакоў

**27 Морзэ Сэмюэл** (1791-1872), амерыканскі мастак і вынаходнік – 235 гадоў з дня нараджэння

**28 Сусветны дзень аховы працы**

**28 Міхалап Мікалай** (1886, г. Мінск – 1979), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка), графік, дызайнер, фатограф, педагог, адзін з арганізатараў і першы дырэктар Дзяржаўнай карціннай галерэі Беларусі – 140 гадоў з дня нараджэння

**28 Хатэнка (па мужу Емяльянава) Антаніна** (1956, в. Зенькаўцы, Зэльв. р-н), пісьменніца, аўтар вершаў, паэм, эсэ, нарысаў – 70 гадоў з дня нараджэння

**28 Лі Харпер** (1926-2016), амерыканская пісьменніца – 100 гадоў з дня нараджэння

**29 Міжнародны дзень танца**

**29 “Скарбніца”**, навукова-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў у складзе канцэрна “Беллегпрам” (г. Мінск, 1976) – 50 гадоў з часу стварэння

**29 Фамін Сяргей** (1906, в. Пепелеўка, Магіл. губ. (цяпер Расія) – 1941), паэт, аўтар вершаў, паэм – 120 гадоў з дня нараджэння

**30 Міжнародны дзень джазу**

**30 Міжнародны дзень свечніка**

**30 Багдановіч Ірына** (1956, г. Ліда), паэтка, літаратуразнаўца, крытык, педагог, аўтар зборнікаў паэзіі, артыкулаў, рэцэнзій і даследаванняў, прысвечаных творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Ф. Багушэвіча, З. Манькоўскай, А. Гарэцкага, В. Дуніна-Марцінкевіча, М. Радзівіл і іншых – 70 гадоў з дня нараджэння

**30 Журба Янка (сапр. Івашын Іван)** (1881, г. Чашнікі – 1964), паэт, перакладчык – 145 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- З кагорты нашаніўцаў

**30 Лепельскі малочнакансервавы камбінат,** ААТ (1951) – 75 гадоў з часу выпуску першай прадукцыі

**30 Сустава Наталля** (1951, Германія), кніжны графік, аўтар ілюстрацый да многіх дзіцячых кніг – 75 гадоў з дня нараджэння

**30 Цэслер (Цеслер) Уладзімір** (1951, г. Слуцк), мастак, які працуе ў галіне графічнага дызайну, канцэптуальнага мастацтва – 75 гадоў з дня нараджэння

# МАЙ

**1 Свята працы**

**1 Алімбекава Дзінара** (1996, Казахстан), беларуская спартсменка (біятлон), чэмпіёнка XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў, заслужаны майстар спорту Беларусі, узнагароджана ордэнам "За асабістую мужнасць", ганаровая грамадзянка Чавускага раёна – 30 гадоў з дня нараджэння

**1 Бабруйскі завод біятэхналогій,** ААТ (1936) – 90 гадоў з часу выпуску першай прадукцыі

**1 Гураў Аркадзь (Арон)** (1956, г. Мінск – 2002), беларускі і ізраільскі кампазітар, які працаваў у галіне камернай музыкі, аўтар сімфоній, сюіт, кантат, музыкі для драматычных спектакляў, дакументальнага кіно – 70 гадоў з дня нараджэння

**1 Лойка Алег** (1931, г. Слонім – 2008), пісьменнік, літаратуразнаўца, крытык, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, кавалер ордэна Дружбы народаў – 95 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Пісьменнік, літаратуразнаўца, настаўнік*

*Я схіляю галаву перад Стокніжжам Алега Лойкі. Гэта каласальная праца. Яна пад сілу толькі чалавеку, які паводле зацікаўленняў сваіх, апантанасці сваёй павінен быў нарадзіцца ў эпоху Леанарда.*

Міхась Скобла

**1 Палякоў Мікалай** (1936, в. Рабяткі, Чавускі р-н), скульптар, які працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры, аўтар скульптурных партрэтаў, помнікаў, сюжэтных кампазіцый – 90 гадоў з дня нараджэння

**1 Сакольчык Адам** (1896, в. Вуглы, Мінскі р-н – 1983), бібліёграф, бібліятэкар, педагог, удзельнік Першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў – 130 гадоў з дня нараджэння

**1 Яфрэмаў Аляксандр** (1951, Расія), рэжысёр тэатра і кіно, педагог, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, уладальнік многіх прызоў, прэмій і дыпломаў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў, у тым ліку Гран-пры Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу "Тэлевяршыня-2010" – 75 гадоў з дня нараджэння

**3 Сусветны дзень свабоды друку** (свята ААН)

**3 Сусветны дзень Сонца**

**3 Атаманаў Алег** (1956, Зэльв. р-н), паэт, спявак, кампазітар, выканавец уласных песень, культурны і грамадскі дзеяч – 70 гадоў з дня нараджэння

**4 Міжнародны дзень пажарных**

Кніжная выстава:
*Пажарнікам Чарнобыля – вечная ўдзячная памяць!*

**4 Дзень зорных войнаў**

**4 Беларускі тэатральны фестываль,** першы агляд драматычных калектываў рэспублікі (г. Віцебск; 1991) – 35 гадоў з часу правядзення

**5 Міжнародны дзень барацьбы за правы інвалідаў**

**5 Міжнародны дзень акушэркі**

**5 Дзень друку**

**5 Гарбатоўскі Віктар** (1936, в. Тушавая, Горацкі р-н – 2002), хормайстар, кампазітар, дзеяч самадзейнага мастацтва, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, кавалер ордэна "Знак Пашаны" – 90 гадоў з дня нараджэння

**5 "Сівельга",** ЗАТ, прадпрыемства, якое спецыялізуецца на вытворчасці абутку з натуральнай скуры (1996) – 30 гадоў з часу стварэння

**5 Якавенка Васіль** (1936, в. Пажыхар, Светлагор. р-н – 2018), пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч, аўтар раманаў, аповесцей, нарысаў, эсэ, артыкулаў, твораў для дзяцей – 90 гадоў з дня нараджэння

**5 Сянкевіч Генрык** (1846-1916), польскі пісьменнік, Нобелеўскі лаўрэат – 180 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Гісторыя вачыма нашага земляка*

**6 Сімураў Аляксандр** (1921, Гарадоцкі р-н – 2007), журналіст, пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння

**6 Усціновіч Анатоль** (1931, г. Ліда – 2009), вучоны ў галіне педыятрыі, арганізатар аховы здароўя, які зрабіў значны ўклад у станаўленне службы педыятрыі ў Беларусі, аўтар звыш 130 навуковых прац, у тым ліку рэдактар першага ў СССР даведніка па педыятрыі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння

**6 Юндзіл Станіслаў** (1761, Воран. р-н – 1847), прыродазнаўца, батанік, заолаг, адзін з першых даследчыкаў раслціннасці Беларусі, заснавальнік батанічнага сада ў Вільні – 265 гадоў з дня нараджэння

**6 Фрэйд Зігмунд** (1856-1939), аўстрыйскі неўролаг і псіхолаг, заснавальнік школы псіхааналізу – 170 гадоў з дня нараджэння

**7 Дзень радыё**

**7 Фралянкоў Аляксандр** (1956, г. Крычаў), мастак, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу – 70 гадоў з дня нараджэння

**7 Тагор Рабіндранат** (1861-1941), індыйскі пісьменнік і грамадскі дзеяч, Нобелеўскі лаўрэат – 165 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:

- Голас Індыі, пачуты светам

**7 Бартко Уладзімір** (1946), кінарэжысёр, сцэнарыст, народны артыст Расіі і Украіны – 80 гадоў з дня нараджэння

**8 Сусветны Дзень Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца**

**8 Іаан Рыльскі (свецкае імя Пашын Іван)** (1881, Мазыр. пав., Мін. губ.– 1938), рэлігійны дзеяч, святы, епіскап – 145 гадоў з дня нараджэння

**8 Рацько Леанід** (1951, в. Кель, Капыл. р-н), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (мастацкая апрацоўка металу), дызайнер, жывапісец – 75 гадоў з дня нараджэння

**8 Дзень памяці і прымірэння, прысвечаны загінуўшым у Другой сусветнай вайне** (свята ААН)

**9 Дзень Перамогі**

**9 Дзень Еўропы**

Кніжная выстава:

*Казачная скарбонка народаў Еўропы*

**9 Бакст (сапр. Розенберг) Леў** (1866, г. Гродна – 1924), тэатральны мастак, графік, кніжны ілюстратар, жывапісец, адным з вучняў якога быў М. Шагал – 160 гадоў з дня нараджэння

**9 Давыдзенка Леанід** (1941, г. Мінск – 2002), скульптар, творы якога ўпрыгожваюць вуліцы Мінска, радзівілаўскі парк у Нясвіжы, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Траццякоўскую галерэю ў Маскве, мастак, жывапісец, графік, педагог – 85 гадоў з дня нараджэння

**9 Ліхадзіеўскі Сцяпан** (1911, в. Баслаўцы, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер в. Барок, Слуцкі р-н) – 1979), паэт, літаратуразнаўца – 115 гадоў з дня нараджэння

**9 Шматаў Віктар** (1936, г. п. Камарын, Браг. р-н – 2006), мастацтвазнаўца, мастак, аўтар многіх вядомых палотнаў, даследчык кніжнай і станковай графікі Беларусі, мастацкай спадчыны Францыска Скарыны, знаўца і ініцыятар ратавання помнікаў народнага мастацтва чарнобыльскай зоны, на аснове якіх быў створаны Музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, ганаровы грамадзянін Брагіна – 90 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:

*Мастак і мастацтвазнаўца Віктар Шматаў*

*Беларусь мае літаральна ўсё, каб стаць квітнеючай нацыянальнай еўрапейскай дзяржавай. Багатай, адметнай, самабытнай.*

Віктар Шматаў

**10 Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь** – другая нядзеля

**10 Гаўрусёў Сцяпан** (1931, Дубров. р-н – 1988), паэт, крытык, перакладчык, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова – 95 гадоў з дня нараджэння

**10 Кавалёў Анатоль** (1926, в. Даўгаполле, Гарадоцкі р-н – 2015), мастацтвазнаўца, жывапісец, дызайнер, педагог, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны – 100 гадоў з дня нараджэння

**11 Літвін Мікалай** (1951, в. Пятрэвічы, Баран. р-н), кампазітар, педагог – 75 гадоў з дня нараджэння

**11 Фрдзюшын Анатоль** (1891, г. Слуцк – 1972), вучоны ў галіне заалогіі, паразіталогіі, паляўніцтвазнаўства і аховы прыроды, заслужаны дзеяч навукі Расіі, па праекце якога створаны Бярэзінскі

**5**
**Сянкевіч Генрык (1846–1916), польскі пісьменнік – 180 гадоў з дня нараджэння**





**16**
**Вітка Васіль (1911–1996), паэт, пісьменнік, крытык – 115 гадоў з дня нараджэнн**

**19**
**Воранаў Натан (1916–1978), жывапісец – 110 гадоў з дня нараджэння**



біясферны запаведнік, заснавальнік заагеаграфіі Беларусі – 135 гадоў з дня нараджэння

**12 Міжнародны дзень медыцынскай сястры**

**12 Дзень экалагічнай адукацыі**

**12 Ашмянскі сыраробчы завод**, філіял ААТ "Лідскі малочна-кансервавы камбінат" (1966) – 60 гадоў з часу ўводу ў эксплуатацыю

**12 Кругавых Мікалай** (1926, Расія – 1994), пісьменнік, сцэнарыст, аўтар раманаў, аповесцяў, апавяданняў – 100 гадоў з дня нараджэння

**13 Гайдукевіч (Гейдукевіч) Станіслаў** (1876, г. Мінск – 1937), архітэктар, сярод асноўных работ якога – жылы дом на вул. Захар'еўскай, даходны дом Е. Кастравецкай, будынак польскага банка, Дом селяніна ў Мінску (не захаваліся), будынак санаторыя "Беларусь" (г. Сочы; у суаўтарстве) – 150 гадоў з дня нараджэння

**13 Сербантовіч Анатоль** (1941, в. Ордаць, Шклоўскі р-н – 1970), паэт, аўтар вершаў, паэм, вянкоў санетаў – 85 гадоў з дня нараджэння

**14 Бекю Аўгуст** (1771, г. Гродна – 1824), беларускі педагог, доктар і прафесар медыцыны, доктар філасофіі, адзін з вядучых дзеячаў аховы здароўя Літвы і Беларусі пачатку XIX ст., адзін з першых у Беларусі і Літве пачаў вакцынацыю супраць воспы – 255 гадоў з дня нараджэння

**14 Пацей Казімір** (1666-1728), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага – 360 гадоў з дня нараджэння

**14 Ромер Эдвард Ян** (1806-1878), грамадскі дзеяч Літвы і Беларусі, літаратар, перакладчык, мастак-аматар, удзельнік паўстання 1830-1831 гг. – 220 гадоў з дня нараджэння

**15 Сусветны дзень сям'і** (свята ААН)

Кніжная выстава:

***Сям'я – гэта любоў!***

**15 Міжнародны дзень адмоўнікаў ад вайсковай службы па перакананнях сумлення**

**15 Міжнародны дзень клімату**

**15 Абабурка Мікалай** (1941, в. Морач, Клецкі р-н), мовазнаўца, педагог, даследчык актуальных пытанняў мовы мастацкай літаратуры і культуры маўлення, аўтар вучэбных дапаможнікаў для вышэйшай школы, шэрагу манаграфій і слоўнікаў-даведнікаў – 85 гадоў з дня нараджэння

**15 Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны ў Лондане,** грамадска-культурная ўстанова беларусаў у Англіі (1971) – 55 гадоў з часу адкрыцця

**15 Макіёнак Данат** (1891, былая в. Тамбоўка, Верхнядзв. р-н – 1941), адзін з першых расійскіх лётчыкаў-асаў, удзельнік Першай сусветнай вайны, кавалер Георгіеўскіх крыжоў 3 ступеняў – 135 гадоў з дня нараджэння

**15 "Мінскканцэрт"**, ДУ, галаўная канцэртная арганізацыя сталіцы, у складзе якой канцэртны аркестр "Няміга", вакальная група "Чысты голас". Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (г. Мінск, 2001) – 25 гадоў з часу стварэння

**15 Рубіна Рыва (Рэвека)** (1906, г. Мінск – 1987), яўрэйская пісьменніца, крытык, перакладчыца, літаратуразнаўца – 120 гадоў з дня нараджэння

**15 Сачанка Барыс** (1936, в. Вялікі Бор, Хойн. р-н – 1995), пісьменнік, перакладчык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа, Літаратурнай прэміі імя І. Мележа, кавалер двух ордэнаў "Знак Пашаны", узнагароджаны медалём Францыска Скарыны – 90 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:

***Быў апантаны працай на карысць Беларусі***

**15 Тарас Ніна** (1916, в. Заполле, Навагр. пав., Мін. губ. (цяпер Навагр. р-н) – 2006), паэтка, перакладчыца, удзельніца партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну – 110 гадоў з дня нараджэння

**15 Булгакаў Міхаіл** (1891-1940), расійскі пісьменнік, драматург, тэатральны рэжысёр – 135 гадоў з дня нараджэння

**15 Трошын Уладзімір** (1926-2008), спявак, акцёр, народны артыст РСФСР – 100 гадоў з дня нараджэння

**16 Міжнародны дзень мірнага суіснавання**

**16 Дзень біёграфаў**

**16 Вітка Васіль (сапр. Крысько Цімох)** (1911, в. Еўлічы, Слуцкі р-н – 1996), паэт, пісьменнік, крытык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі – 115 гадоў з дня нараджэння

Кніжныя выставы:

***Казкі дзеда Васіля***

*З чаго пачынаецца сонечны дзень?*
*Вядома, што з новае казкі.*

Васіль Вітка

***Беларускі Андэрсен***

*Весела дзённая казка ідзе,*
*Бае, што бачыць і чуе,*
*І за сабою сяброўак вядзе –*
*Вячэрнюю і начную.*

Васіль Вітка

***Промень шчасця – жыць пад родным небам!***

*Сярод жывых не першы,*
*Не лепшы між памерлых,*
*На рыфмах зубы з'еўшы,*
*Пісаў свае я вершы*
*Для дома, для альбома*
*І трохі*
*Для эпохі!*

Васіль Вітка

**16 Мельнікаў Міхаіл** (1921, г. Крычаў – 1993), краязнаўца, музейны работнік, стваральнік Крычаўскага краязнаўчага музея, заслужаны работнік культуры Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння

**16 Музей Максіма Багдановіча,** дзяржаўная ўстанова па зборы, захаванні, вывучэнні, прэзентацыі, папулярызацыі творчай спадчыны М. Багдановіча (г. Гродна; адкрыты 16 мая 1986 г. як аддзел Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея; у 1995-2013 гг. існаваў як самастойная ўстанова; з 1 студзеня 2014 г. – Літаратурны аддзел Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея) – 40 гадоў з часу адкрыцця

**17 Сусветны дзень памяці ахвяр СНІД** – трэцяя нядзеля

**17 Міжнародны дзень барацьбы з гамафобіяй**

**17 Упершыню публічна прадэманстраваны каляровы фотаздымак,** зроблены па метаду фізіка Джэймса Максвэла (1861) – 165 гадоў таму

**17 Гадулька Васіль** (1946, в. Федзькавічы, Жабінк. р-н – 1993), паэт, аўтар лірычных вершаў, санетаў, педагог – 80 гадоў з дня нараджэння

**17 Маркоўскі Стафан** (1886, Украіна – 1949), музыкант, педагог, заснавальнік беларускай школы ігры на ўдарных інструментах – 140 гадоў з дня нараджэння

**17 Мурашка Ларыса** (1951, г. Мінск), кампазітар, педагог – 75 гадоў з дня нараджэння

**17 Радзівіл Ян Мікалай Аляксандр** (1681-1729), дзяржаўны дзеяч ВКЛ – 345 гадоў з дня нараджэння

**17 Смольскі Бекір** (1966, г. Мінск), мастак манументальна-дэкаратыўнага мастацтва – 60 гадоў з дня нараджэння

**18 Міжнародны дзень музеяў**

**18 Бакуменка Мікалай** (1941, Украіна), скульптар, аўтар твораў у манументальнай, станковай і мемарыяльнай скульптуры – 85 гадоў з дня нараджэння

**19 Алена Іванаўна** (1476, Расія – 1513), вялікая княгіня літоўская, каралева польская, жонка вялікага князя літоўскага і караля польскага Аляксандра, дачка вялікага князя маскоўскага Івана III – 550 гадоў з дня нараджэння

**19 Воранаў Натан** (1916, г. Магілёў – 1978), жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння

**19 Жабінкаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей,** установа культуры (в. Малыя Сяхновічы, Жабінк. р-н, 2011) – 15 гадоў з часу адкрыцця

**20 Сусветны дзень пчол**

**20 Сусветны дзень метралогіі**

**20 Сусветны дзень траўматолага**

**20 Рэспубліканскае навукова-даследчае ўнітарнае прадпрыемства "Бел НДЦ «Экалогія»",** навукова-даследчая і каардынацыйна-метадычная ўстанова ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання (г. Мінск, 1991) – 35 гадоў з часу стварэння

**20 Марэсьеў Аляксей** (1916-2001), расійскі лётчык, Герой Савецкага Саюза – 110 гадоў з дня нараджэння

**21 Сусветны дзень культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця**

**21 Міжнародны дзень гарбаты** (свята ААН)

**21 Дзень памяці Іаана Багаслова (заступніка аўтараў, рэдактараў і выдаўцоў)**

**21 Дзюрэр Альбрэхт** (1471-1528), нямецкі мастак і тэарэтык мастацтва эпохі Адраджэння – 555 гадоў з дня нараджэння

**21 Сахараў Андрэй** (1921-1989), расійскі фізік, акадэмік, палітычны дзеяч, праваабаронца, Нобелеўскі лаўрэат – 105 гадоў з дня нараджэння

**22 Міжнародны дзень біялагічнай разнастайнасці**

**22 Заснавана Міжнародная федэрацыя кіналагаў** (1911) – 115 гадоў таму

**22 Бараноўская Галіна** (1936, Расія – 2021), архітэктар, па праектах якой пабудаваны шэраг аб'ектаў у Мінску, Валожынскім і Смалявіцкім раёнах, мастак-графік – 90 гадоў з дня нараджэння

**23 Сусветны дзень чарапахі**

**Кніжная выстава:**
***Чарапахі з казачных старонак***

***23 Лагерквіст Пер*** *(1891-1974), шведскі пісьменнік, Нобелеўскі лаўрэат – 135 гадоў з дня нараджэння*

**23 Чухрай Рыгор** (1921-2001), расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст, педагог, народны артыст СССР – 105 гадоў з дня нараджэння

**24 Дзень славянскага пісьменства і культуры (дзень святых Мяфодзія і Кірылы)**

**Кніжная выстава:**
***Вясёлка славянскіх казак***

**24 Еўрапейскі дзень паркаў**

**24 Прайшоў першы конкурс песні Еўрабачання** (1956) – 70 гадоў таму

**24 Філіял установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт" Гомельскі дзяржаўны політэхнічны каледж,** УА (1946) – 80 гадоў з часу стварэння

**24 Дылан Боб** (1941), амерыканскі аўтар-выканаўца песень, акцёр, мастак, Нобелеўскі лаўрэат – 85 гадоў з дня нараджэння

**25 Дзень ручніка**

**25 Міжнародны дзень зніклых дзяцей**

**25 Сусветны дзень шчытападобнай залозы**

**26 Беларускі міжнародны фестываль тэатраў лялек** (Мінск, 1981) – 45 гадоў з часу правядзення Першага фестываля тэатраў лялек Беларусі

**3 Домрачава Дар'я** (1986, г. Мінск), спартсменка (біятлон), заслужаны майстар спорту Беларусі, чэмпіёнка і сярэбраны прызёр XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў, трохкратная чэмпіёнка XXII зімовых Алімпійскіх гульняў, бронзавы прызёр XXI зімовых Алімпійскіх гульняў, чэмпіёнка свету, Герой Беларусі, узнагароджана ордэнам Айчыны III ступені, ордэнам "За асабістую мужнасць" — 40 гадоў з дня нараджэння

**3 Драненка Мікалай** (1946, в. Маргойцы, Сенненск. р-н), мастак, які працуе ў станковым жывапісе, графіцы, акварэлі — 80 гадоў з дня нараджэння

**3 Кальмаева Людміла** (1946, г. Мінск), плакатыст, графік, жывапісец — 80 гадоў з дня нараджэння

**3 "Сынам Айчыны, што загінулі за яе межамі",** храм-помнік, прысвечаны беларускім воінам-інтэрнацыяналістам, якія загінулі ў Афганістане ў 1979–1989 гг., філіял Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (г. Мінск, 1996) — 30 гадоў з часу адкрыцця

**4 Мазур Вікторыя** (1946, г. Магілёў — 2015), артыстка аперэты, народная артыстка Беларусі — 80 гадоў з дня нараджэння

**4 Радзівіл Дамінік Геранім** (1786, Брэсцкае ваяв. — 1813), ваенны дзеяч — 240 гадоў з дня нараджэння

**4 Армстронг Луі** (1901–1971), амерыканскі джазавы музыкант — 125 гадоў з дня нараджэння

**5 Міжнародны дзень светлафора**

**5 Аляксандр** (1461, Польшча — 1506), вялікі князь ВКЛ, кароль Польшчы — 565 гадоў з дня нараджэння

**5 Дзюбайла Павел** (1931, в. Кукарава, Бярэз. р-н — 1995), крытык, літаратуразнаўца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа — 95 гадоў з дня нараджэння

**5 Захараў Пётр** (1936, в. Карпавічы, Светлагор. р-н — 2013), жывапісец, мастак тэатра, лаўрэат прэстыжных усесаюзных і міжнародных конкурсаў і фестываляў, уладальнік медаля Беларускага саюза мастакоў "За заслугі ў выяўленчым мастацтве" — 90 гадоў з дня нараджэння



**5 Клецкая бітва 1506 г.** паміж войскам Вялікага Княства Літоўскага на чале з М.Л. Глінскім і войскам крымскіх татар — 520 гадоў з часу першай вялікай перамогі ВКЛ над крымскімі татарамі

**5 Мішчанчук Уладзімір** (1946, в. Валавель, Драгіч. р-н), акцёр тэатра і кіно, педагог, заслужаны артыст Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны — 80 гадоў з дня нараджэння

**5 Сытчанка Уладзімір** (1951, г. Маладзечна), графік, жывапісец — 75 гадоў з дня нараджэння

**6 Сусветны дзень барацьбы за забарону ядзернай зброі**

**6 Міжнародны дзень "Лекары свету за мір"**

**6 Брэсцкая абласная філармонія,** дзяржаўная ўстанова (1986) — 40 гадоў з часу заснавання

**6 Ванееў Уладзімір** (1896, Расія — 1941), партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, удзельнік Першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў — 130 гадоў з дня нараджэння

**6 Віцязь Пётр** (1936, в. Першамайская, Бяроз. р-н), вучоны ў галіне распрацоўкі новых матэрыялаў, тэхналогій і машынабудавання, акадэмік НАН Беларусі і Акадэміі ваенных навук Расіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Савета Міністраў СССР, НАН Беларусі і Сібірскага аддзялення РАН імя В.А. Капцюга, прэміі акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы, кавалер ордэна Дружбы народаў, Айчыны II ступені, Айчыны III ступені, узнагароджаны медалём Францыска Скарыны — 90 гадоў з дня нараджэння

**6 Дробаў Леанід** (1926, в. Растаў, Акцябр. р-н — 2002), мастацтвазнаўца і жывапісец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — 100 гадоў з дня нараджэння

**6 Локун Валянціна** (1946, в. Цепянец, Пін. р-н — 2016), літаратуразнаўца, крытык, даследчыца творчасці В. Быкава, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава і інш., лаўрэат прэміі прэзідэнтаў акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы — 80 гадоў з дня нараджэння



**27 Драйзер Тэадор** (1871–1945), амерыканскі пісьменнік — 155 гадоў з дня нараджэння



**3 Кальмаева Людміла** (1946, г. Мінск), плакатыст, графік, жывапісец — 80 гадоў з дня нараджэння



**16 Білібін Іван** (1876–1942), расійскі мастак — 150 гадоў з дня нараджэння

**6 Васняцоў Апалінарый** (1856–1933), расійскі мастак, майстр гістарычнага жывапісу, мастацтвазнаўца — 170 гадоў з дня нараджэння

**6 Флемінг Аляксандр** (1881–1955), брытанскі вучоны-бактэрыёлаг, Нобелеўскі лаўрэат — 145 гадоў з дня нараджэння

**8 Міжнародны дзень афтальмалогіі**

**8 Міжнародны дзень альпінізму (Дзень альпініста)**

**8 Сусветны дзень котак**

**8 Асяндоўскі Антон** (1876, г. Люцын, Віцеб. губ. (цяпер Латвія) — 1945), пісьменнік, журналіст, падарожнік, вучоны — 150 гадоў з дня нараджэння

**8 Надсан (сапр. Бучко) Аляксандр** (1926, г. Нясвіж ці г.п. Гарадзея — 2015), рэлігійны і грамадскі дзеяч беларускага замежжа, адзін з заснавальнікаў Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі, кіраўнік Беларускай бібліятэкі і музея імя Францыска Скарыны ў Лондане — 100 гадоў з дня нараджэння

**9 Дзень будаўніка** — другая нядзеля

**9 Сусветны дзень кнігалюбаў**

**9 Міжнародны дзень карэнных народаў свету**

**9 Дзень памяці ахвяраў атамнага ўдару ў Нагасакі**

**9 Запруднік Янка (сапр. Вільчыцкі Сяргей)** (1926, г.п. Мір, Карэл. р-н — 2022), вучоны-гісторык, палітолаг, паэт, літаратуразнаўца, публіцыст, грамадска-культурны дзеяч беларускага замежжа — 100 гадоў з дня нараджэння

**9 Міклашэўскі Яўген** (1936, Польшча — 2010), пісьменнік, перакладчык, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа — 90 гадоў з дня нараджэння

**10 "Белкард"**, ААТ (г. Гродна; з 1951 г.) — 75 гадоў з часу стварэння

**10 Брэсцкі электралямпавы завод,** ААТ, прадпрыемства па вырабу лямпаў напальвання агульнага і спецыяльнага прызначэння, адзін з буйнейшых вытворцаў у краінах СНД (1966) — 60 гадоў з часу атрымання першай прадукцыі

**10 Дарафееў Анатоль** (1941, в. Лажані (па іншых звестках — в. Верамеева), Гарадоцкі р-н — 2010), вучоны, краязнаўца, публіцыст, грамадскі дзеяч, педагог, выдатнік асветы СССР, выдатнік вышэйшай школы СССР, выдатнік народнай асветы Беларусі — 85 гадоў з дня нараджэння

**10 Смілавіцкі сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй,** дзяржаўная ўстанова адукацыі (Чэрв. р-н, 1931) — 95 гадоў з часу прыняцця рашэння аб адкрыцці

**10 Татарнікаў Юрый** (1941, Расія — 2005), мастак, які працаваў у станковым жывапісе і акварэлі, педагог — 85 гадоў з дня нараджэння

**11 Барысаўскі дзяржаўны каледж,** установа адукацыі (2006) — 20 гадоў з часу стварэння

**12 Міжнародны дзень моладзі**

**12 Гомельскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж народных мастацкіх промыслаў,** установа адукацыі (1976) — 50 гадоў з часу стварэння

**12 Калітоўская Клаўдзія** (1911, в. Уселюб, Навагр. р-н — 2002), артыстка балета, педагог, заслужаны дзеяч культуры Беларусі — 110 гадоў з дня нараджэння

**12 Сом Лера (Алена)** (1966, г. Полацк), пісьменніца, журналістка, бард — 60 гадоў з дня нараджэння

**12 Берынг Вітус** (1681–1741), мараплаўца, афіцэр расійскага флоту, палярны даследчык — 345 гадоў з дня нараджэння

**12 Блавацкая Алена** (1831–1891), расійская пісьменніца, рэлігійны філосаф, заснавальніца тэасофскага аб'яднання — 195 гадоў з дня нараджэння

**13 Міжнародны дзень леўшуноў**

**13 Лышчык Аляксандр** (1951, г. Камянец), скульптар, аўтар твораў у манументальнай і станковай скульптуры — 75 гадоў з дня нараджэння

**14 Шпакоўскі Іван** (1936, в. Мясяцічы, Пін. р-н — 2008), літаратуразнаўца, крытык, даследчык праблем тэорыі літаратуры, шляхоў развіцця беларускай, рускай і ўкраінскай паэзіі — 90 гадоў з дня нараджэння

**15 Дзень археолага**

**15 Мінскі дзяржаўны каледж гандлю,** установа адукацыі (1956) — 70 гадоў з часу заснавання

**15 Мінскі інстытут кіравання,** прыватная ўстанова адукацыі (1991) — 35 гадоў з часу стварэння

**15 Рэспубліканскі біялагічны заказнік "Спораўскі",** дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова на тэрыторыі Івацэв., Іван., Бяроз. і Драгіч. р-наў (1991) — 35 гадоў з часу стварэння

**15 Скот Вальтэр** (1771–1832), англійскі паэт, празаік і гісторык — 255 гадоў з дня нараджэння

**15 Тарывердзіеў Мікаэл** (1931–1996), кампазітар, народны артыст РСФСР — 95 гадоў з дня нараджэння

**15 Сусветны дзень беспрытульных жывёл** — трэцяя субота

**16 Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа,** установа (г. Мінск, 1956; адкрыты для наведвальнікаў 4 снежня 1959 г.) — 70 гадоў з часу заснавання

**16 Матульскі Раман** (1961, Украіна), вучоны ў галіне бібліятэказнаўства, аўтар звыш чатырохсот навуковых прац, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, узнагароджаны медалём "За працоўныя заслугі", знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За ўклад у развіццё культуры Беларусі", выдатнік друку Беларусі, ганаровы архівіст Беларусі, кавалер ордэна Беларускай Праваслаўнай Царквы свяціцеля Кірылы Тураўскага ІІ ст., ордэна "Крылатага льва" Міжнароднай грамадскай арганізацыі "Ліга развіцця навукі і адукацыі" — 65 гадоў з дня нараджэння

**16 Білібін Іван** (1876–1942), расійскі мастак — 150 гадоў з дня нараджэння

Кніжна-ілюстраваная выстава:
*Іван Білібін. Квітнеючае дрэва*

**18 Брава Алена** (1966, г. Барысаў), пісьменніца, аўтар аповесцяў, апавяданняў, вершаў, журналіст — 60 гадоў з дня нараджэння

**18 Букчын Сямён (Самуіл)** (1941, Расія), крытык, літаратуразнаўца, пісьменнік, публіцыст — 85 гадоў з дня нараджэння

**18 Краўцоў Макар (сапр. Касцевіч Макар)** (1891, в. Баброўня, Грод. р-н — 1939), паэт, перакладчык, публіцыст, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, удзельнік Першай сусветнай вайны, Слуцкага паўстання 1920 г. — 135 гадоў з дня нараджэння

**18 Марціновіч Алесь (Аляксандр)** (1946, в. Казловічы, Слуцкі р-н), літаратуразнаўца, крытык, публіцыст, краязнаўца, журналіст, празаік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя К. Каліноўскага, Нацыянальнай літаратурнай прэміі — 80 гадоў з дня нараджэння

Тэматычныя паліцы:
- Гісторыя праз лёсы
- Спадчыннік Слуцкага краю

**19 Сусветны дзень фатаграфіі**

**19 Сусветны дзень гуманітарнай дапамогі**

**19 Яблычны Спас**

**19 Гардзей Віктар** (1946, в. Малыя Круговічы, Ганц. р-н — 2025), пісьменнік, перакладчык, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа, дыпламант Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор года "Залаты Купідон" — 80 гадоў з дня нараджэння

**19 Кескевіч Валерый** (1951, г. Брэст), архітэктар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі міжнароднага конкурса ЮНЕСКА і Міжнароднага саюза архітэктараў "Жыллё — заўтра", прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" — 75 гадоў з дня нараджэння

**19 Мурзіч Адам** (1941, г. Ляхавічы), заслужаны работнік культуры Беларусі, мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, педагог — 85 гадоў з дня нараджэння

**19 Ткачоў Мікалай** (1941, в. Вудага, Чэрык. р-н), жывапісец, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу — 85 гадоў з дня нараджэння

**19 Энэску Джорджэ** (1881–1955), румынскі кампазітар, скрыпач, дырыжор і педагог — 145 гадоў з дня нараджэння

**20 Крупенька Яўген** (1936, в. Саськаўка, Шклоўскі р-н — 1990), паэт, крытык, перакладчык, публіцыст, аўтар зборнікаў лірычных вершаў, паэм, сатырычных і гумарыстычных твораў, кніжак для дзяцей, нарысаў, літаратурна-крытычных артыкулаў і рэцэнзій — 90 гадоў з дня нараджэння

**21 Міжнародны дзень памяці і памінання ахвяр тэрарызму**

**21 Міхайлава Галіна** (1946, г. Віцебск), мастачка, якая працуе ў манументальным і станковым жывапісе — 80 гадоў з дня нараджэння

**21 Паслядовіч Макар** (1906, в. Караваева, Пух. р-н — 1984), пісьменнік, аўтар гумарыстычных апавяданняў, літаратурных пародый, нарысаў, п'ес, твораў для дзяцей — 120 гадоў з дня нараджэння

**21 Чаропка Вітаўт (Віктар)** (1961, г. Мінск), пісьменнік, літаратар, гісторык, журналіст — 65 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Адкрывальнік і летапісец сівой даўніны*

**22 Буйніцкі Ігнат** (1861, Глыб. р-н — 1917), акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч, стваральнік беларускага нацыянальнага прафесійнага тэатра — 165 гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава:
*Крок па сцэне — у вечнасць палёт*

**22 Дзідзічэнка Ірына** (1936, Расія), артыстка балета, заслужаная артыстка Беларусі — 90 гадоў з дня нараджэння

**22 Лакштанаў Іосіф** (1911, Украіна — 1986), тэатральны акцёр і рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі — 115 гадоў з дня нараджэння

**22 Ліпшыц Жак (Хаім-Якаў)** (1891, Грод. губ. (цяпер Літва) — 1973), французскі і амерыканскі

скульптар, які пры жыцці атрымаў сусветнае прызнанне — 135 гадоў з дня нараджэння

**23 Дзень работнікаў дзяржаўнай статыстыкі**

**23 Меранкоў Міхаіл** (1936, Украіна), мастак, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу, аўтар сюжэтна-тэматычных карцін, партрэтаў, пейзажаў, нацюрмортаў, педагог — 90 гадоў з дня нараджэння

**24 Маркавец-Бартлава Валянціна** (1951, в. Янкі, Докш. р-н), майстар габеленаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва, архітэктуры — 75 гадоў з дня нараджэння

**25 Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР**, акт урачыстага абвяшчэння суверэнітэту краіны, першы афіцыйны крок да незалежнасці Беларусі (г. Мінск, 1991) — 35 гадоў з часу набыцця статусу канстытуцыйнага закона

**25 Праскураў Васіль** (1926, в. Негаціна, Дубров. р-н — 1987), пісьменнік, публіцыст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя П. М. Лепяшынскага — 100 гадоў з дня нараджэння

**25 Салтук Алег** (1946, в. Рыжэнькі, Шуміл. р-н — 2015), паэт, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор года "Залаты Купідон" — 80 гадоў з дня нараджэння

**26 Рубцоў Уладзімір** (1936, в. Мар'іна, Добруш. р-н — 2010), мастак у галіне станковага жывапісу ў жанрах карціны, нацюрморта — 90 гадоў з дня нараджэння

**27 Лада-Заблоцкі (Заблоцкі-Лада) Тадэвуш Гіляравіч** (1811, в. Лугінава, Сенн. пав., Магіл. губ. (цяпер Сенн. р-н) — 1847), паэт, перакладчык — 215 гадоў з дня нараджэння

**27 Ламановіч Ніна** (1951, в. Лапічы, Асіп. р-н), харавы дырыжор, педагог, народная артыстка Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны, уладальніца знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" — 75 гадоў з дня нараджэння

**27 Новік-Пяюн (сапр. Новік) Сяргей** (1906, в. Лявонавічы, Нясвіж. р-н — 1994), паэт, празаік, кампазітар, культурна-асветны дзеяч, аўтар вершаў, апавяданняў, п'ес, каля сотні песень і рамансаў — 120 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- З верай у светлую зорку Радзімы

**27 Палачанін Фёдар** (1951, в. Чаркасы, Докш. р-н), драматург, лаўрэат Рэспубліканскай літаратурнай прэміі "Залаты Купідон", літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — 75 гадоў з дня нараджэння

**27 Франко Іван** (1856–1916), украінскі пісьменнік, паэт, публіцыст — 170 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- Кнігі Франко ўзносяць дух

**27 Драйзер Тэадор** (1871–1945), амерыканскі пісьменнік і грамадскі дзеяч — 155 гадоў з дня нараджэння

**27 Ранеўская Фаіна** (1896–1984), расійская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка СССР — 130 гадоў з дня нараджэння

Тэматычная паліца:
- Талент непаўторны, незабыўны

**27 Ступка Багдан** (1941–2012), расійскі і ўкраінскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР і Украіны — 85 гадоў з дня нараджэння

**28 Александровіч Віктар** (1951, в. Слабодка, Астрав. р-н), графік — 75 гадоў з дня нараджэння

**28 Барысік Васіль** (1926, в. Горнае, Глускі р-н — 2010), работнік сельскай гаспадаркі, заслужаны меліяратар БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, кавалер ордэна "Знак Пашаны", ганаровы грамадзянін г. Старыя Дарогі –100 гадоў з дня нараджэння

**28 Бураўкін Генадзь** (1936, в. Тродавічы, Расон. р-н — 2014), паэт, перакладчык, дзяржаўны дзеяч Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы — 90 гадоў з дня нараджэння

**Кніжныя выставы:**

***Незабыўныя інтанацыі Генадзя Бураўкіна***

*І ёсць у класіцы папраўкі на*
*Неўтаймаванага Бураўкіна.*

Рыгор Барадулін

*1. Яго Полацк*

*Вось і клянуся полацкаму краю,*
*Дзе над Дзвіной крутыя берагі,*
*Што аж да скону вернасць захаваю*
*І песнямі аддам свае даўгі.*

*2. Пасляваенны горкі лёс*

*Народ мой, дзякую табе,*
*Што ні на міг мне не дазволіў,*
*Каб я кагосьці абязволіў,*
*Жыў у кагосьці на гарбе.*

*3. Будзе, будзе да скону мне Чарнобыль балець*

*Няўтульнай і непрыгожай*
*Зямля быць ніколі не можа.*
*Бруднай, шэрай і беднай*
*Робіць яе чалавек.*

*4. Заўсёды быў я з родным словам*

*І правіла прыдумалі не мы,*
*Што там, дзе не шануюць роднай мовы,*
*Мялеюць рэкі, нішчацца дубровы,*
*Каля магілак пасвяцца каровы,*
*Народ там мёртвы, і той край нямы.*

*5. Такі спрадвечны лёс*

*Гісторыя, разумніца сівая,*
*Сваім дыханнем чыстым на ляту*
*Ад ісціны рашуча адсявае*
*Бяздарную, базарную лухту.*

***6. Зарука вечнага жыцця — каханне***

*І зразумець аднойчы, што жыццё*
*Пустым было б і вартым спачування,*
*Калі б на свеце не было кахання,*
*Дзе ўсё спрадвек — сакрэт і адкрыццё.*

***7. Ты, мой народ, мяне не папракнеш***

*Я крыж свой без папроку нёс*
*І бінтаваў спагадай раны.*
*І не хачу мяняць свой лёс,*
*Які мне ўжо наканаваны.*

***А калі не спяваць аб Радзіме, дык навошта наогул спяваць?***

*Каб убачыць паэзію ў радку "Якое шчасце — жыць на белым свеце..." — трэба доўга на белым свеце пажыць. І шмат чаго перажыць, і пра перажытае напісаць, і многае — калі не ўсё — зразумець.*

Уладзімір Някляеў

***1. Я не забыў, дзе мой выток***

*Калі я пад'язджаю да яго і здалёк бачу купал Сафіі і блакітны выгіб Дзвіны,— сэрца ў мяне б'ецца так соладка і радасна, як нідзе болей. Гэта ж Полацк. Мой Полацк.*

***2. Апаленая памяць***

*Палюбіў густую просінь неба,*
*Люта зненавідзеўшы вайну.*

***3. Застанецца на роднай мове радок***

*Я вас не абражу маной,*
*Не ўражу фантазіяй смелай.*
*Было гэта з вамі, са мной*
*Ці ў нашай душы набалелай.*

***4. Пакуль будуць жанчыны, не змоўкнуць паэты***

*Я ўсіх вас, закаханыя зямлі,*
*Назваць братамі роднымі гатовы.*

***5. Не пытайцеся, чаму ўспамінаюць паэтаў***

*Што нас падкупляе, заварожвае ў паэзіі Бураўкіна, змушае суперажываць — гэта чалавечае ў гэтай паэзіі.*

Масей Сяднёў

***Тэматычныя паліцы:***

- Люблю свой край, зялёны і спакойны

*Пра вечнае,*
*Пра вечнае,*
*Асноўнае з асной,*
*Дзе Беларусь прасвечвае*
*З усіх легенд і сноў.*

- Уваходжу ў лес, нібыта ў хату

*Я ўдзячны лёсу, што з усіх краёў*
*Ён выбраў для мяне навекі гэты.*

- Куды б толькі ты ні пайшоў, сустрэне прырода жывая

*Так хочацца добрае штосьці зрабіць*
*І мудрае штосьці сказаць.*

- Жыве мова — жыве народ

*Ты нам даруй, калі зможаш,*
*Самотны Максім!*

- Я веру: нешта ў свеце застанецца

*Перад зграяй безабаронны,*
*Пад вятрамі трываючы ледзь,*
*І памру я белай варонай,*
*Не збіраючыся чарнець.*

**28 Лойка Георгій** (1946, Расія), жывапісец, які працуе ў жанрах пейзажа, нацюрморта, камернага і гістарычнага партрэта, педагог, аўтар навучальных дапаможнікаў па выяўленчым мастацтве — 80 гадоў з дня нараджэння

**28 Майсеенка Яўсей** (1916, г.п. Уваравічы, Буда-Кашал. р-н — 1988), жывапісец, графік, педагог, народны мастак СССР, акадэмік АМ СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РСФСР імя Рэпіна, Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР — 110 гадоў з дня нараджэння

**29 Міжнародны дзень дзеянняў супраць ядзерных выпрабаванняў**

**29 Дзятлаўскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей,** дзяржаўная ўстанова (1966; адкрыты для наведвальнікаў 5 мая 1968 г.) — 60 гадоў з часу заснавання

**29 Улашчанка Леанід** (1941, Украіна), акцёр, заслужаны артыст Беларусі, аўтар трох зборнікаў казак для дзяцей — 85 гадоў з дня нараджэння

**30 Дзень шахцёра** — апошняя нядзеля

**30 Любамудраў Павел** (1916, Расія — 1984), графік, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — 110 гадоў з дня нараджэння

**30 Хоцімскі гісторыка-краязнаўчы музей,** дзяржаўная ўстанова культуры (1996) — 30 гадоў з часу заснавання (адкрыты 26 верасня 1998 г.).

**30 Цэнтральны навукова-даследчы і праектна-тэхналагічны інстытут арганізацыі і тэхнікі кіравання,** ААТ (г. Мінск 1961) — 65 гадоў з часу заснавання

**30 Чыкер-Агінскі Ігар** (1926, в. Рудня Кашалёўская, Буда-Кашал. р-н — 2001), жывапісец, паэт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны — 100 гадоў з дня нараджэння

**31 Дзень блога**

**31 Браварская Зінаіда** (1916, Украіна — 2005), актрыса, рэжысёр, педагог, народная артыстка Беларусі — 110 гадоў з дня нараджэння

## ВЕРАСЕНЬ

**1 Дзень нараджэння ансамбля "Песняры"**

Тэматычная паліца:

- Голас зямлі беларускай

**1 Дзень ведаў**

**1 Дзень нафтавіка**

**1 Беларуска-Расійскі ўніверсітэт,** дзяржаўная ўстанова вышэйшай прафесійнай адукацыі (г. Магілёў, 1961) — 65 гадоў з часу адкрыцця

**1 Глушакоў Валерый** (1926, г. Бабруйск — 2005), артыст оперы, народны артыст Беларусі — 100 гадоў з дня нараджэння

**1 "Класік-Авангард",** ансамбль салістаў установы "Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія", лаўрэат спецыяль-

12 **Лем Станіслаў** (1921–2006), польскі пісьменнік-фантаст, філосаф, публіцыст, футуролаг — 105 гадоў з дня нараджэння



6 **Дзень беларускага пісьменства — першая нядзеля**

15 **Дзень бібліятэк**



най прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" (г. Мінск, 1991) — 35 гадоў з часу набыцця самастойнасці

**1 Салодкі Уладзімір** (1956, ст. Галынец, Магіл. р-н), спявак, заслужаны артыст Беларусі — 70 гадоў з дня нараджэння

**1 Сауліч Уладзімір** (1951, Глыб. р-н), драматург — 75 гадоў з дня нараджэння

**1 Чырвонабярэжскі крухмала-патачны завод,** ААТ (в. Красны Бераг (Чырвоны Бераг), Жлоб. р-н; 1931) — 95 гадоў з часу ўводу ў эксплуатацыю

**2 Дамарацкі Уладзімір** (1946, г. Гомель — 2000), кампазітар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — 80 гадоў з дня нараджэння

**2 Зайцава Ларыса** (1946, г. Бабруйск), кіназнаўца, выкладчык вышэйшай школы, лаўрэат прэміі Беларускага саюза кінематаграфістаў — 80 гадоў з дня нараджэння

**2 Сакалоўскі Рыгор** (1946, Украіна — 2011), паэт, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, удзельнік вайны ў Афганістане — 80 гадоў з дня нараджэння

**2 Казанцаў Аляксандр** (1906–2002), расійскі пісьменнік-фантаст — 120 гадоў з дня нараджэння

**2 Лявонаў Яўген** (1926–1994), акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР — 100 гадоў з дня нараджэння

**3 "Белаграпрамбанк",** ААТ, адзін з буйнейшых банкаў Беларусі, шматкратны пераможца нацыянальнага конкурсу "Брэнд года" (г. Мінск, 1991) — 35 гадоў з пачатку дзейнасці

**3 Богуш-Сестранцэвіч Станіслаў** (1731, Свісл. р-н — 1826), вучоны, які працаваў у галіне гісторыі, філалогіі, медыцыны і інш., дзеяч Рымска-каталіцкай Царквы, заснавальнік Магілёўскай друкарні, член Расійскай АН і Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі — 295 гадоў з дня нараджэння

**3 Сергіевіч Мікола (Мікалай)** (1921, Салігор. р-н — 2000), пісьменнік, нарысіст — 105 гадоў з дня нараджэння

**3 Даўлатаў Сяргей** (1941–1990), расійскі і амерыканскі пісьменнік, журналіст — 85 гадоў з дня нараджэння

**4 Дуброўскі (сапр. Чарняўскі) Ігнат** (1906, в. Дуброва, Смаляв. р-н — 2003), пісьменнік, вучоны ў галіне сельскагаспадарчых навук, заслужаны работнік культуры Беларусі — 120 гадоў з дня нараджэння

**4 Яновіч Сакрат** (1936, Беластоцкае ваяв.— 2013), польскі і беларускі пісьменнік, публіцыст, аўтар літаратуразнаўчых прац і крытычных артыкулаў пра творчасць беларускіх пісьменнікаў, якія жывуць у Польшчы — 90 гадоў з дня нараджэння

**5 Міжнародны дзень дабрачыннасці**

**5 Вольскі (сапр. Вольскі-Зэйдэль) Віталь** (1901, Расія — 1988), пісьменнік, драматург, тэатральны крытык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі — 125 гадоў з дня нараджэння

**5 Салей Іван** (1931, в. Раўкі, Маст. р-н — 2012), заслужаны будаўнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер ордэна Леніна — 95 гадоў з дня нараджэння

**5 Шальманаў Іван** (1936, в. Каромка, Буда-Кашал. р-н — 1993), пісьменнік, аўтар апавяданняў, аповесцей, нарысаў — 90 гадоў з дня нараджэння

**5 Мейербер Джакома** (1791–1864), нямецкі кампазітар, стваральнік жанру французскай вялікай оперы — 235 гадоў з дня нараджэння

**6 Дзень беларускага пісьменства** — першая нядзеля

**6 Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа,** рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне (1921) — 105 гадоў з часу стварэння

**6 Беларускі камітэт міру,** грамадская арганізацыя (г. Мінск, 1951) — 75 гадоў з часу стварэння

**6 Усава Любоў** (1921, Расія — 2015), архітэктар, сярод асноўных работ якой — шэраг грамадскіх і жылых будынкаў на Прывакзальнай плошчы, комплекс будынкаў Беларускага політэхнічнага інсты-

тута (БНТУ), праектаў сквера ля Тэатра оперы і балета, паркаў Перамогі і 30-годдзя УЛКСМ і інш.— 105 гадоў з дня нараджэння

**7 Сусветны дзень знішчэння ваеннай цацкі**

**7 Булыга Уладзімір** (1936, в. Канюцічы, Мін. р-н — 2009), скульптар, мастак, які працаваў у галіне станковай і манументальнай скульптуры, педагог, аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў — 90 гадоў з дня нараджэння

**7 Гайдук Уладзімір** (1941, Польшча — 2012), беларускі паэт з Беласточчыны — 85 гадоў з дня нараджэння

**7 "Класіка індустрыі моды" (КІМ)**, ААТ у складзе канцэрна "Беллегпрам", адзін з буйнейшых у Беларусі вытворцаў панчошна-трыкатажнай прадукцыі (г. Віцебск, 1931) — 95 гадоў з часу стварэння

**8 Заснаваны Гарвардскі ўніверсітэт — адзін з вядучых ВНУ ЗША (1636)** — 390 гадоў таму

**8 Нямцоў Віктар** (1941, Расія), мастак дэкаратыўна-прыкладнога і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісец, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — 85 гадоў з дня нараджэння

**8 Трубяцкі Мікалай** (1836, Расія — 1902), дзяржаўны дзеяч, генерал-лейтэнант, губернатар Мінскай губерні (1886–1902), які шмат зрабіў для эканамічнага і культурнага развіцця Мінска — 190 гадоў з дня нараджэння

**8 Дворжак Антанін** (1841–1904), чэшскі кампазітар — 185 гадоў з дня нараджэння

**9 Карнілаў Іван** (1811–1901), расійскі дзяржаўны дзеяч, асветнік, папячыцель Віленскай навучальнай акругі, кіраваў дзейнасцю Віленскай археаграфічнай камісіі, якая па яго ініцыятыве выдала 4 тамы Археаграфічнага зборніка дакументаў і Тураўскае евангелле, у якіх шмат звестак па гісторыі Беларусі і Літвы — 215 гадоў з дня нараджэння

**9 Ліманоўскі Янка (Іван)** (1896, Мёр. р-н — 1989), пісьменнік, літаратуразнаўца, тэатральны дзеяч — 125 гадоў з дня нараджэння

**10 Кныш Рэнальд** (1931, г. Капыль — 2019), трэнер (гімнастыка спартыўная), заслужаны трэнер Беларусі і СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі, ганаровы грамадзянін Гродна — 95 гадоў з дня нараджэння

**10 Парсаданаў Георгій** (1911, Расія — 1989), архітэктар, сярод асноўных работ якога — генпланы гарадоў Мінск, Слуцк, Рэчыца, Магілёў, Салігорск, заслужаны архітэктар Беларусі — 115 гадоў з дня нараджэння

**11 Гардзіёнак Ігар** (1971, в. Кублішчына, Ушацкі р-н), мастак, педагог, уладальнік многіх дыпломаў рэспубліканскіх конкурсаў "Мастацтва кнігі", а таксама Гран-пры "Тоеснасць" конкурсу "Мастак і кніга" — 55 гадоў з дня нараджэння

**11 Піён Марыс (Маўрыцы)** (1801, Францыя — 1869), танцоўшчык, балетмайстар, тэатральны дзеяч, стваральнік і кіраўнік Віцебскага балета Піёна — 225 гадоў з дня нараджэння

**11 Ткачук Васіль** (1926, Украіна — 2005), мастак-графік, які працаваў у тэхніцы эстампа, лінагравюры — 100 гадоў з дня нараджэння

**11 Цэйс Карл Фрыдрых** (1816–1888), нямецкі оптык-механік, канструктар мікраскопаў — 210 гадоў з дня нараджэння

**11 Дастаеўская Ганна** (1846–1918), расійская мемуарыстка, стэнаграфістка, памочніца і другая жонка Ф. Дастаеўскага — 180 гадоў з дня нараджэння

**12 Лем Станіслаў** (1921–2006), польскі пісьменнік-фантаст, філосаф, публіцыст, футуролаг — 105 гадоў з дня нараджэння

**13 Жугжда Алег** (1961, Літва), рэжысёр тэатра, галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога тэатра лялек, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат тэатральнай прэміі імя Л. Мазалеўскай і многіх міжнародных фестываляў тэатраў лялек, уладальнік прыза Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі "Крыштальны анёлак" — 65 гадоў з дня нараджэння

**13 Дзень памяці ахвяр фашызму** — другая нядзеля

**13 Сусветны дзень жураўля** — другая нядзеля

**13 Салаўёў Аляксандр** (1926, Расія — 2021), мастак тэатра, жывапісец, графік, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, кавалер ордэна Ф. Скарыны — 100 гадоў з дня нараджэння

**13 Шалігоўскі Тадэвуш** (1896, Украіна — 1963), польскі кампазітар і педагог, арганізатар і ўдзельнік экспедыцыі па зборы беларускага фальклору на Гродзеншчыне, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Польшчы — 130 гадоў з дня нараджэння

**13 Даль Роальд** (1916–1990), англійскі пісьменнік, майстар парадаксальнага апавядання — 110 гадоў з дня нараджэння

**14 Зелянко Кацярына** (1916, Украіна — 1941), лётчыца, удзельніца савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг., абароны Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, адзіная ў свеце жанчына, якая здзейсніла паветраны таран — 110 гадоў з дня нараджэння

**15 Міжнародны дзень дэмакратыі**

**15 Дзень бібліятэк**

**15 Дзень нараджэння экалагічнай арганізацыі "Грынпіс" (Greenpeace)**, 1971–55 гадоў таму

**15 Кісялёў Фёдар** (1946, в. Іванава Слабада, Клім. р-н — 2019), мастак-акварэліст, які працуе пераважна ў жанры акварэлі, педагог — 80 гадоў з дня нараджэння

**15 Панятоўскі Станіслаў** (1676, Польшча — 1762), дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства

Літоўскага і Рэчы Паспалітай, генерал артылерыі Вялікага Княства Літоўскага, генерал кавалерыі шведскай арміі, генерал-лейтэнант польскага войска, удзельнік Паўночнай вайны 1700–1721 гг.— 350 гадоў з дня нараджэння

**16** **Міжнародны дзень аховы азонавай абалонкі**

**16** **Гродзенская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. Макаёнка** (1946) — 80 гадоў з часу стварэння



**16** **Законнікаў Сяргей** (1946, в. Слабада, Бешанк. р-н), паэт, публіцыст, журналіст, перакладчык, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы, Міжнароднай літаратурнай прэміі імя В. Гулевіча, Міжнароднай літаратурнай прэміі імя Р. Скаварады — 80 гадоў з дня нараджэння

Кніжныя выставы:

*Беларускае сэрца Сяргея Законнікава*

*1. Што нас у свеце падманным ратуе?*
*Тое, што нельга купіць і прадаць.*
*2. Тыя, што душой сваёй, як промнем,*
*Асвятляюць шлях да добрай долі.*
*3. Жыццё замыкаецца ў коле заклятым:*
*Ахвяры і каты, ахвяры і каты.*
*4. Айчына мае абярог, і ён найперш*
*У родным слове.*
*5. У каханні ёсць радасць, пакуты і слёзы,*
*У каханні няма аднаго — перамог.*

*Жыццё пражыць — нібыта скласці песню*

*Ідучы па дарозе зямной,*
*Я сваю Беларусь берагу, як сумленне.*
*Гэта вечная праўда стаіць за спіной,*
*Гэта вечная воля плыве прада мной,*
*І няма ад смяротнай любові збавення.*

*1. Радасць, пакуты і памяць жывая*
*Зліты ў даверлівым слове.*
*2. Калі б загаварылі курганы,*
*Дзе спіць святая праўда даўніны.*
*3. Жанчына, каханне, жыццё.*
*Замкнута ад нас адкрыццё,*
*А ключ пад падушкай у Бога.*

Тэматычныя паліцы:

- Я проста думаю, пішу, я размаўляю з белым светам…

*З першых публікацый Сяргей Законнікаў быў сур'ёзным. Паэзія ніколі не была для яго забаўкай, хай і цікавай, хай і прыемнай. Не была яна для яго і проста маладым, прыгожым захапленнем. Была яна адразу справай.*

Генадзь Бураўкін

- Роднага слова жывое святло

*Мова незаменная, у вяках нятленная,*
*Не зважай на здзекі, мкні святую плынь.*
*Беларусь драўляную, Беларусь каменную,*
*Выбач ці не выбач, толькі не пакінь.*

Сяргей Законнікаў

- Сяргей Законнікаў: толькі не патушы свечку сваёй душы!
- Чарнобыль у паэзіі і публіцыстыцы Сяргея Законнікава

**16** **Казловіч Анатоль** (1946, в. Горск, Бяроз. р-н — 2011), пісьменнік, журналіст, педагог — 80 гадоў з дня нараджэння

**16** **Лысенка Пётр** (1931, в. Зарачаны, Полацкі р-н — 2020), вучоны ў галіне археалогіі, па матэрыялах даследаванняў якога створаны археалагічныя музеі "Бярэсце" і "Старажытны Тураў", аўтар шматлікіх навуковых прац, у т. л. манаграфій, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ганаровы грамадзянін Турава і Пінска — 95 гадоў з дня нараджэння

**16** **Нацыянальны парк "Белавежская пушча"**, (1991), дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова, раён найбольш высокаўзроставых лясоў Белавежскай пушчы, уключаны ЮНЕСКА ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны чалавецтва; знаходзіцца на тэрыторыі Камянецкага, Пружанскага і Свіслацкага раёнаў (запаведны рэжым устаноўлены ў 1409 г.) — 35 гадоў з часу стварэння нацыянальнага парку

**17** **Татур Генрых** (1846, г. Слуцк ці г. Мінск — 1907), археолаг, гісторык, краязнаўца, калекцыянер — 180 гадоў з дня нараджэння

**18** **Сусветны дзень маніторынгу вады**

**18** **Навахрост Аляксандр** (1951, Круп. р-н), кампазітар — 75 гадоў з дня нараджэння

**18** **Кіраўнічая кампанія холдынга "Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка»"**, ТАА, прадпрыемства па вытворчасці абутку павышанага камфорту і класічнага элегантнага абутку ў складзе абутковага холдынга "Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка»" (г. Віцебск, 1991) — 35 гадоў з часу заснавання

**19** **Дзень нараджэння "Смайліка"**

**19** **Батальёнак Ягор** (1946, в. Вялікія Труханавічы, Чашн. р-н), жывапісец-пейзажыст, педагог, творы якога захоўваюцца ў вядучых музеях Беларусі, музеях Расіі, Польшчы, ЗША, лаўрэат Першай прэміі прадстаўніцтва ААН у Беларусі — 80 гадоў з дня нараджэння

**19** **Кавалёў Віктар** (1936, Магіл. р-н — 1999), вучоны-эканаміст, аўтар прац па пытаннях эфектыўнасці і ўдасканалення прамысловага транспарту, арганізацыі, механізацыі і аўтаматызацыі пагрузачна-разгрузачных работ, заснавальнік Магілёўскага фінансава-эканамічнага інстытута — 90 гадоў з дня нараджэння

**19** **Нераток Юрась (сапр. Гарбачоў Юрый)** (1961, Маст. р-н), паэт, празаік — 65 гадоў з дня нараджэння

**19** **Рымскі Генадзь** (1936, Расія — 2000), вучоны ў галіне тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат прэміі НАН Беларусі, паэт, перакладчык — 90 гадоў з дня нараджэння

**19** **Рэспубліка Беларусь,** незалежная ўнітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава



16
**Нацыянальны парк "Белавежская пушча", (1991), дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова, уключаны ЮНЕСКА ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны чалавецтва — 35 гадоў з часу стварэння нацыянальнага парку**

22
**Фарадэй Майкл (1791–1867), англійскі фізік і хімік, заснавальнік вучэння аб электрамагнітным полі — 235 гадоў з дня нараджэння**

25
**Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой", дзяржаўная ўстанова — 55 гадоў з дня ўрачыстага адкрыцця**

ў цэнтры Еўропы (1991) — 35 гадоў з часу прыняцця афіцыйнай назвы "Рэспубліка Беларусь"

**19 Голдзінг Уільям** (1911–1993), англійскі пісьменнік-раманіст, Нобелеўскі лаўрэат — 115 гадоў з дня нараджэння

**20 Дзень мытніка**

**20 Нагнібеда Мікола (Мікалай)** (1911, Украіна — 1985), украінскі паэт, перакладчык, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі УССР імя Т. Р. Шаўчэнкі — 115 гадоў з дня нараджэння

**20 Чаплін Сід** (1916–1986), англійскі пісьменнік — 110 гадоў з дня нараджэння

**21 Міжнародны дзень міру**

**21 Міжнародны дзень распаўсюджвання інфармацыі аб хваробе Альцгеймера**

**21 Тыдзень Сусветнай акцыі "Мы чысцім свет" ("Ачысцім планету ад смецця")**

**21 Асіноўскі Святаслаў** (1951, в. Смаляны, Асіпов. р-н), журналіст, краязнаўца, гісторык, які цікавіцца падзеямі росквіту Вялікага Княства Літоўскага, жыццём і дзейнасцю Гедыміна, Альгерда, Жыгімонта Казіміравіча, Вітаўта — 75 гадоў з дня нараджэння

**21 Кароткіна Ганна** (1961, г. Віцебск — 2019), кампазітар, лаўрэат прэміі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — 65 гадоў з дня нараджэння

**21 Шарль Ніколь** (1866–1936), французскі лекар і мікрабіёлаг, Нобелеўскі лаўрэат — 160 гадоў з дня нараджэння

**21 Уэлс Гербэрт** (1866–1946), англійскі пісьменнік і публіцыст — 160 гадоў з дня нараджэння

**21 Гердт Зіновій** (1916–1996), расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР — 110 гадоў з дня нараджэння

**22 Сусветны дзень без аўтамабіля**

**22 Сусветны дзень абароны сланоў**

**22 Сусветны дзень насарога**

**22 Фарадэй Майкл** (1791–1867), англійскі фізік і хімік, заснавальнік вучэння аб электрамагнітным полі — 235 гадоў з дня нараджэння

**23 Міжнародны дзень мовы жэстаў**

**23 Жлобінскі дзяржаўны металургічны каледж,** установа адукацыі па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне металургіі (1996) — 30 гадоў з пачатку дзейнасці

**23 Радзівіл (Сангушка) Ганна Кацярына** (1676, аг. Ракаў, Валож. р-н — 1746), гаспадарчая дзяячка Вялікага Княства Літоўскага, заснавальніца Налібоцкай і Урэцкай шкляных мануфактур, мецэнатка — 350 гадоў з дня нараджэння

**23 Свістуновіч Сямён** (1946, в. Конькі, Ляхав. р-н), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (габелен), жывапісец — 80 гадоў з дня нараджэння

**23 Ціханава Вольга** (1956, Казахстан), мастачка, якая працуе ва ўсіх жанрах станковага жывапісу — 70 гадоў з дня нараджэння

**23 Якубовіч Павел** (1946, Расія), журналіст, выдавец, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне", выдатнік друку Беларусі, кавалер ордэнаў Пашаны, Айчыны III ступені — 80 гадоў з дня нараджэння

**24 Незабітоўскі (Незабытоўскі) Станіслаў Прэцлаў** (1641, в. Ятра, Навагр. р-н — 1717), мемуарыст, успаміны якога з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі грамадска-палітычнага жыцця Беларусі і Літвы канца XVII ст., дзяржаўны і гаспадарчы дзеяч — 385 гадоў з дня нараджэння

**24 Фіцджэральд Фрэнсіс Скот** (1896–1940), амерыканскі пісьменнік — 130 гадоў з дня нараджэння

**25 Кляцкоў Міхаіл** (1946, Расія), мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка), работы якога знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, музеі

Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, краязнаўчых музеях Гомельскай вобласці, прыватных калекцыях — 80 гадоў з дня нараджэння

**25 Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой",** дзяржаўная ўстанова, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (1971) — 55 гадоў з дня ўрачыстага адкрыцця

**25 Міранка,** гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Карэл. р-н, 1996) — 30 гадоў з часу стварэння

**25 Швакшты,** гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Пастаўскі р-н, 1996) — 30 гадоў з часу стварэння

**25 Шастаковіч Дзмітрый** (1906–1975), расійскі кампазітар, піяніст, педагог, народны артыст СССР — 120 гадоў з дня нараджэння

**26 Міжнародны дзень барацьбы за поўную ліквідацыю ядзернай зброі**

**26 Сусветны дзень кантрацэпцыі**

**26 Еўрапейскі дзень моў**

**27 Міжнародны дзень глухіх** — апошняя нядзеля

**27 Дзень машынабудаўніка** — апошняя нядзеля

**27 Сусветны дзень турызму**

**27 Антонаў Аляксей** (1896, г. Гродна — 1962), ваенны дзеяч, генерал арміі, удзельнік Першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, удзельнік распрацоўкі плана Беларускай аперацыі 1944 г., адзіны з ураджэнцаў Беларусі кавалер ордэна "Перамога" — 130 гадоў з дня нараджэння

**27 Жданові Ірына** (1906, г. Мінск — 1994), актрыса, педагог, народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі — 120 гадоў з дня нараджэння

**28 Сусветны дзень барацьбы супраць шаленства**

**29 Сусветны дзень сэрца**

**29 Смоліч Аркадзь** (1891, в. Бацэвічы, Кліч. р-н — 1938), вучоны ў галіне эканомікі, сельскай гаспадаркі, картаграфіі, геаграфіі, адзін з заснавальнікаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і адзін з распрацоўшчыкаў яе першага статута, першы беларускі прафесар геаграфіі і аўтар першага падручніка "Геаграфія Беларусі", які вытрымаў шмат перавыданняў, палітычны і грамадскі дзеяч — 135 гадоў з дня нараджэння

**Тэматычныя паліцы:**

- Патрыёт і навуковец Аркадзь Смоліч
- Адкрыць для беларусаў Беларусь

*"Геаграфія" Смоліча і цяпер застаецца непераўзыдзеным узорам навуковага апісання нашае зямлі.*

Уладзімір Арлоў

**29 Сянько Веньямін** (1946, г. Скідзель), вучоны ў галіне чыгуначнага транспарту, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, ганаровы чыгуначнік, ганаровы грамадзянін Гомеля — 80 гадоў з дня нараджэння

**29 Фэрмі Энрыка** (1901–1954), італьянскі вучоны-фізік, Нобелеўскі лаўрэат — 125 гадоў з дня нараджэння

**30 Міжнародны дзень перакладчыка**

**30 Астаповіч Аркадзь** (1896, г. Мінск — 1941), графік, які працаваў у жанры лірычнага пейзажу ў тэхніках акварэлі і тушы — 130 гадоў з дня нараджэння

**30 Гілевіч Ніл** (1931, в. Слабада, Лагойскі р-н — 2016), паэт, літаратуразнаўца, фалькларыст, перакладчык, грамадскі дзеяч, народны паэт Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы і Міжнароднай прэміі імя Х. Боцева, ўзнагароджаны шматлікімі ордэнамі — 95 гадоў з дня нараджэння

**Кніжныя выставы:**

***Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч***

***Заклік нераўнадушнага сэрца***

*Калі вырашаецца лёс краіны і народа — дык не сядзець жа, стаўшыся…*

Ніл Гілевіч

***Вялікі паэт, буйны навуковец, палымяны публіцыст***

***Ніл Гілевіч: чалавек і творца***

***Трыбунны і публіцыстычны Гілевіч***

***Шчыраваць над словам, над радком: талент і праца Ніла Гілевіча***

**Тэматычныя паліцы:**

- Ніл і Ніна: гісторыя аднаго кахання
- Ніл Гілевіч пра любімыя кнігі
- Смех-змагар ад змагара-паэта
- Дбайны руплівец народнай спадчыны
- Пісьменніцкі вянок у гонар Ніла

**30 Гумоўскі Мар'ян** (1881, Польшча — 1974), польскі нумізмат, гісторык, музеязнаўца, які пэўны час быў дырэктарам музея Чапскіх — 145 гадоў з дня нараджэння

**30 Несцярэнка Васіль** (1941, в. Дабея, Шуміл. р-н), мастак, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу, педагог — 85 гадоў з дня нараджэння

**30 Сямілетаў Барыс** (1956, г. Мінск), мастак манументальна-дэкаратыўнага і прыкладнога мастацтва, жывапісец, творы якога знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, фондзе Беларускага саюза мастакоў, прыватных калекцыях у Беларусі і за мяжой — 70 гадоў з дня нараджэння

**30 Шміт Ота** (1891, г. Магілёў — 1956), расійскі вучоны ў галіне матэматыкі, астраноміі, геафізікі, падарожнік, адзін з арганізатараў засваення Паўночнага марскога шляху, акадэмік АН СССР, АН Украіны, Герой Савецкага Саюза, кавалер ордэна Леніна, дзяржаўны дзеяч, імя якога носіць Аб'яднаны інстытут фізікі Зямлі РАН — 135 гадоў з дня нараджэння